Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 108 (5782) | 12 мая 1937 г., серада | ЦАНА 10 КАП.

МОСКВА 19
УЛ. ФРУНЗЕ 10 ИН. ТУТ
СТРОИТ. И ПРАВА
13 ЗН 2

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ — Кроўная справа кожнага члена КП(б)Б.

І. Валкавічэр — Да трыццапігоддзя пятага з'езда партыі.

І. Осіпаў — Новыя манеўры фашысцкай Германіі.

Р. Фралоў — Антырэлігійнай прапагандай не займаюцца.

АБМЕРКАВАННЕ ПЫТАННЯЎ ТРЭЦЯГА ПЯЦІГАДОВАГА ПЛАНА: **Сляпян** — Аб вытворчасці будаўнічых матэрыялаў; **І. А. Захараў** — Усямерна развіць ільнопрадзільную і ткацкую прамысловасць.

Арк. Зарубежны — На заводзе імя Кірава раскрадаюць машыны.

У наркамаце абароны.

ЗА РУБЯЖОМ:

Пасля трацкісцка-фашысцкага путча ў Каталоніі;

Манеўры японскай ваеншчыны;

«Мірнае» заваяванне Данцыга гітлераўцамі.

Японія рыхтуе новыя наступленні на Паўночны Кітай;

На франтах у Іспаніі.

КРОЎНАЯ СПРАВА КОЖНАГА ЧЛЕНА КП(б)Б

Больш двух месяцаў прайшло з таго часу, як лютаўскі Пленум ЦК ВКП(б) скончыў сваю работу. У друку апублікаваны важнейшыя дакументы, якія з'явіліся рэзультатам работы Пленума. Даклад і заключнае слова па дакладу таварыша Сталіна, даклад тав. Жданава і рэзалюцыя па яго дакладу ўзброілі комуністаў для барацьбы з недахопамі ў партыйнай рабоце і ўказалі канкрэтныя шляхі выпраўлення прарываў і недахопаў у рабоце.

Справаздачна-выбарчыя сходы пярвічных партыйных арганізацый КП(б)Б прайшлі пад знакам глыбокага і канкрэтнага вывучэння гэтых гістарычных дакументаў. Члены КП(б)Б на сваіх сходах апалчыліся супроць дабрадушнасці і бестурботнасці, павысілася рэволюцыйная пільнасць і ўзровень большэвіцкай самакрытыкі.

Падхалімству, бестурботнасці, даверлівасці і дабрадушнасці члены КП(б)Б аб'явілі рашучую барацьбу. У радзе партыйных арганізацый у час справаздачна-выбарчых сходаў выкрыты ворагі народу (Наркамзем БССР і інш.). Асабліва жорстка комуністы крытыкавалі буйнейшыя недахопы арганізацыі прапагандысцкай і агітацыйнай работы, паслабленне сувязі з масамі ў радзе арганізацый. Ва многіх партыйных арганізацыях устаноўлена, што член і кандыдат партыі не быў у цэнтры ўвагі партыйнай работы.

На справаздачна-выбарчых сходах, як правіла, прыняты канкрэтныя рэзалюцыі, ў якіх выкрыты прарывы ў рабоце пярвічных партыйных арганізацый. Пастанова лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) і рашэнні сходаў пярвічных партыйных арганізацый з'яўляюцца той праграмай, якую пярвічныя партыйныя арганізацыі павінны зараз ажыццяўляць.

Прыходзіцца, аднак, адзначыць, што многія кіраўнікі пярвічных партыйных арганізацый зразумелі, як відаць, крытыку недахопаў пастаноўкі партыйнай работы як кампанію. Ускрытыя недахопы ў рабоце не перамагаюцца. У радзе пярвічных партыйных арганізацый Менска, Оршы, Бабруйска, Гомеля, Барысава і Магілева партыйныя камітэты не выпрацавалі яшчэ планаў работы, не размеркавалі яшчэ абавязкаў паміж членамі новага партыйнага камітэта.

Характэрна, што на скончыўшых сваю работу раённых партыйных канферэнцыях г. Менска амаль ніхто з выступаўшых не сказаў аб тым, як ён выконвае рашэнні лютаўскага Пленума ЦК, як ён ліквідуе тыя недахопы ў пастаноўцы партыйнай работы, якія былі адзначаны на сходах пярвічных партыйных арганізацый. Гэты факт упушчае сур'ёзную трывогу. Ён паказвае, што кіраўнікі многіх пярвічных партыйных арганізацый г. Менска, як відаць, думаюць, што дастаткова прыняць добрую рэзалюцыю, і справа ўжо пойдзе сама сабой. Між тым, добрая рэзалюцыя, гэта толькі пачатак справы. Галоўнае — у арганізацыі работы, ў праверцы выканання таго, што намечана, што запісана ў рэзалюцыі.

«Пасля таго, — гаварыў таварыш Сталін, — як дано правільнае рашэнне пытання, поспех справы залежыць ад арганізацыйнай работы, ад арганізацыі барацьбы за правядзенне ў жыццё лініі партыі, ад правільнага падбору людзей, ад праверкі выканання рашэнняў кіруючых органаў. Без гэтага правільная лінія партыі і правільныя рашэнні рызыкуюць папярпець сур'ёзную страту. Больш таго: пасля таго, як дана правільная палітычная лінія, арганізацыйная работа вырашае ўсё, у тым ліку і лёс самой палітычнай лініі, — яе выкананне, або яе правал».

У час выбараў пярвічных партыйных арганізацый у КП(б)Б амаль па адну трэць абноўлен склад сакратароў партыйных камітэтаў і парторгаў. Так, напрыклад, у Сталінскім раёне г. Менска ў 17 з 35 буйных пярвічных партарганізацый абраны новыя сакратары партыйных камітэтаў. У Аршанскім раёне абраны 3 новыя сакратары парткомаў і 8 парторгаў і т. д. Яшчэ больш абнавіўся склад партыйных камітэтаў. У кіраўніцтва пярвічнымі партыйнымі арганізацыямі ўлілася новая, вялікая група людзей, якая не мае яшчэ дастатковых навыкаў партыйнай работы. Гэты факт абавязвае раённыя партыйныя камітэты прыняць усе меры да таго, каб уключыць новых людзей у актыўную партыйную работу. Ад раённых партыйных камітэтаў патрабуецца зараз быстрая арганізацыя перадачы станоўчага вопыту партыйнай работы. Гэта—абсалютна ясная і не патрабуючае доказаў палажэнне. Між тым ні адзін раённы камітэт КП(б)Б у гэтай галіне нічога сур'ёзнага амаль не зрабіў.

У рашэннях лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) зусім ясна ўказана, што ў пярвічных партыйных арганізацыях павінны быць падабраны намеснікі сакратара парткома. У хуткім часе ў Менску пачнуць працаваць курсы сакратароў партыйных камітэтаў і іх намеснікаў. І зноў-такі прыходзіцца канстатаваць, што пярвічныя партыйныя арганізацыі да набору на гэтыя курсы зусім не гатовы.

Такім чынам, галоўнейшае пытанне — пытанне аб кадрах — у пярвічных партыйных арганізацыях не рашана. Пастанова лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) не выканана. Тлумачыцца гэта тым, што многія райкомы, у тым ліку нават і райкомы буйныя, не зразумелі, як відаць, што галоўнае звяно зараз, гэта — кадры.

«Галоўнае, — вучыць нас таварыш Сталін, — у арганізацыйнай рабоце — **падбор людзей і праверка выканання».**

Неабходна папярэдзіць палўленне «звычайных» настрояў, што быццам летам і вясной нельга весці прапагандысцкую работу. Рашэнні лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) і сходаў пярвічных партыйных арганізацый КП(б)Б абавязваюць партыйныя камітэты неадкладна прагледзець сістэму прапагандысцкай работы і рашуча палепшыць справу прапаганды вучэння Маркса — Энгельса — Леніна—Сталіна. Адналутнае патрабаванне члена КП(б)Б і кандыдата ў члены партыі — наладзіць справу прапаганды марксізма-ленінізма — павінна быць выканана ва што-б там ні стала. Зноў-такі, пачынаць трэба з кадраў, з падбору і праверкі людзей, годных да прапагандысцкай работы, з расстаноўкі іх на рашаючых участках работы.

Галоўнае патрабаванне сходаў пярвічных партыйных арганізацый — палепшыць выкладанне гісторыі партыі. Сухія выказванні, адрыў вучэння аб стратэгіі і тактыцы партыі ад гістарычных падзей і фактаў, якімі грашыла выкладанне гісторыі партыі, выклікалі вялікае незадаволенне слухачоў. Таварыш Сталін у сваіх заўвагах на падручнікі па гісторыі партыі паказвае нам, як трэба паставіць выкладанне пікавейшай навукі — гісторыі партыі ў школах і гуртках партыйнай асветы. Гэтыя ўказанні павінны быць пакладзены ў аснову ўсёй метадычнай работы выкладчыкаў і прапагандыстаў сеткі партыйнай асветы. Сакратары раённых камітэтаў партыі асабіста павінны кіраваць перабудовай выкладання гісторыі партыі ў гуртках і школах партыйнай асветы.

У цэнтры ўвагі ўсёй партыйнай работы павінна быць пастаўлена работа з членам і кандыдатам партыі, авалоданне большэвізмам, узмацненне сувязі з масамі, рашучае палепшэнне ўсёй агітацыйнай работы, узлым самакрытыкі і павышэнне рэволюцыйнай пільнасці — у гэтым асноўны змест партыйнай работы.

Партыйная арганізацыя, дзе комуніст не ўцягнут у актыўную партыйную работу, не з'яўляецца актыўным бойцом — дрэнная партыйная арганізацыя. Лютаўскі Пленум ЦК ВКП(б) абавязвае кожнага комуніста працаваць па-новаму, пікавіцца ўсімі галінамі жыцця і работы, быць пільным, не замоўчваць недахопаў і прамахаў, якія ён бачыць. Партыйная арганізацыя павінна будаваць сваю работу так, каб гэтыя патрабаванні праз'яўленыя лютаўскім Пленумам ЦК да членаў партыі, былі выкананы кожным комуністам, кожным кандыдатам у члены КП(б)Б.

У буйнейшых гарадах БССР пачынаюцца раённыя і гарадскія партыйныя канферэнцыі. На гэтых канферэнцыях, несумненна, будзе яшчэ вышэй узнят сцяг большэвіцкай самакрытыкі. Ні адзін больш-менш буйны прарыў у рабоце раённых камітэтаў не павінен быць пакінут без увагі, тым больш увагу комуністаў павінен прыцягнуць той факт, што большасцю раённых камітэтаў рашэнні лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) выконваюцца дрэнна.

Па-большэвіцку выканаць рашэнні лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) — кроўная справа кожнага комуніста.

У КАМІСІІ СОВЕЦКАГА КАНТРОЛЯ ПРЫ СНК СССР

АБ ЗРЫВЕ НАРКАМЗЕМАМ САЮЗА ССР ВЫКАНАННЯ ПЛАНА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ КАЛГАСАЎ ГАТУНКОВЫМ НАСЕННЕМ

Праверкай Камісіі Совецкага Кантроля пры СНК Саюза ССР устаноўлена, што намеснік начальніка Галоўзярно Наркамзема СССР тав. Кліменка І. Е. распрацаваў дырэктывы аб адмене апрабацыі гатункованага насення калгасных пасеваў, не гледзячы на пратэсты радзу работнікаў Наркамзема (агранома Аксарына і інш.).

Гэтыя дырэктывы былі запверджаны былым намеснікам наркома земляробства Саюза Муралавым А. І. у загадзе, падпісаным ім 14 сакавіка 1936 года і наркомам земляробства тав. Чэрновым у інструкцыі, запверджанай ім 4 мая 1936 г. Гэта заблытала і дэзарганізавала работу па стварэнню фондаў гатункованага насення для веснавой сяўбы 1937 года і значна знізіла якасць гатункованага насення.

Апрача гэтага тт. Кліменка І. Е., Татаеў Н. А. і аграном Галоўзярно Багаслоўскі В. Е., з велама намесніка начальніка Галоўзярно тав. Ішчэнка Ф. Н. склалі яўна няправільны план забеспячэння калгасаў гатунковым насеннем, у якім заведама пераўвялічылі размер выдачы калгасам гатункованага насення са складаў Заготзярно да 15 млн. цэнтнераў, ведаючы, што ўся наяўнасць забраніраванага насення складала 8,9 млн. цэнтнераў. Гэты няправільны план за подпісам наркома земляробства Саюза ССР тав Чэрнова быў прадстаўлен на зацверджанне Ўрада.

Камісія Совецкага Кантроля пастанавіла:

1. Даручыць пракурору Саюза ССР тав. **Вышынскаму** зрабіць тэрміновае расследванне аб зрыве забеспячэння калгасаў гатунковым насеннем былым намеснікам начальніка Галоўзярно тав. Кліменка І. Е., намеснікам начальніка Галоўзярно тав. Ішчэнка Ф. Н., былым загадчыкам агратэхнічнага аддзела Галоўзярно тав. Татаевым Н. А., агранамам па гатунковых фондах Галоўзярно Багаслоўскім В. Е. і іншымі работнікамі Наркамзема і віноўных прыцягнуць да судовай адказнасці.

2. Указаць наркому земляробства Саюза ССР тав. Чэрнову на адсутнасць з яго боку кіраўніцтва і кантролю за насеннай справай, у рэзультаце чаго пагоршылася справа стварэння гатунковых фондаў і сарвана выкананне плана снабжэння калгасаў гатунковым насеннем к пасеву 1937 года.

Гэта пастанова Камісіі Совецкага Кантроля запверджана Соўнаркомам Саюза ССР. (БЕЛТА).

Таварышы Сталін і Варашылаў на Усесаюзнай нарадзе жонак каманднага і начальніцкага складу РСЧА.

Фото І. Шагіна.

АРГАНІЗАВАЦЬ БОЛЬШЭВІЦКУЮ БАРАЦЬБУ ЗА ХУТЧЭЙШАЕ СКАНЧЭННЕ СЯЎБЫ!

АДСТАЮЧЫЯ СОЎГАСЫ

На 5 мая соўгасы сістэмы Наркомсоўгасаў БССР выканалі план сяўбы на 67 проц. Аднак, за гэтай сярэдняй лічбай хаваюцца дзесяткі соўгасаў, якія сеюць недапушчальна марудна. У соўгасе «Лагоза» (дырэктар тав. Еленевіч), Лагойскага раёна, яравымі засеяна толькі 24 проц. плошчы. Соўгас да гэтага часу не закончыў сяўбу ранніх зернавых на плошчы 128 гектараў і вікі на зярно—44 гектары.

Па-ранейшаму знаходзіцца ў прарыве соўгас імя Сталіна (дырэктар тав. Жук), Дзержынскага раёна. Соўгас пры агульным плане сяўбы ў 800 гектараў на 5 мая засеяў толькі 82 гектары, што складае 10 проц. Такі прарыў з сяўбой у гэтым соўгасе тлумачыцца ні чым іншым, як непаваротлівасцю кіраўніцтва соўгаса ў арганізацыі палявых работ, няўменнем арганізаваць працу.

Такое-ж становішча і ў соўгасе «Вялікія Новасёлкі», Дзержынскага раёна. Тут план сяўбы выканан толькі на 18 проц. Дырэктар соўгаса тав. Ерменсон, будучы ў наркамаце сказаў, што аб рабоце дырэктароў соўгасаў трэба меркаваць па выніках сяўбы. Гэтыя словы можна зараз аднесці к самаму Ерменсону.

Дырэктар соўгаса «Боркавічы» тав. Федараў даў у наркамат вочкаўпіранцельскую справаздачу з перавышэннем фактычна засеянай плошчы на 20 гектараў. І гэта ў соўгасе тлумачаць апіскай учотчыка.

Асабліва дрэнна абстаіць справа ў соўгасах з сяўбой прапашных культур. Асобныя дырэктары лічаць, што цяпер спяшацца няма чаго, пасадзіць бульбу паспеем. А па сутнасці — вялікая трывога. Калгасы ў гэтых раёнах далёка апярэдзілі соўгасы. Трэба адзначыць, што трэцяя частка соўгасаў да сяўбы бульбы яшчэ не прыступала.

Такія соўгасы, як «Правда», «Чырвоны Окцябр», «Новыя Зялёнкі», «Зарэчча», «Спартак», маючы план пасеву бульбы звыш 100 гектараў кожны, не пасадзілі ні аднаго гектара. Яравізацыя ў соўгасах сарвана.

Соўгасы ў гэтым годзе, як ніколі, маюць ўсе неабходныя ўмовы для паспяховага правядзення сяўбы. Аднак, ні ў наркамаце, ні ў соўгасах не адчуваецца трывогі за лёс будучага ўраджаю. **М. КАГАН.**

ПРАЦА НА СЯЎБЕ НЕ АРГАНІЗАВАНА

Калгасы Старобінскага раёна сеюць надзвычайна марудна. На 5 мая плян сяўбы выканан толькі на 58,7 проц. Раён мог-бы пасеяць значна больш, але такімі пытаннямі, як арганізацыяй працы ў калгасах, працоўнай дысцыплінай ніхто ў раёне не займаўся. Масава-палітычная работа ў калгасах не праводзіцца. Загадчык райзя тав. Юнкур і дырэктар МТС тав. Казлоў у калгасах бываюць рэдка. Аб ходзе сяўбы яны ведаюць толькі па зводках. Уся іх аператыўная работа звялася да пісання пустых дырэктыў і пастаноў. Не дзіва, што калі сойтупца ўдваіх, то адзін у другога пытае: «У каго-б гэта дакладна даведацца, як ідзе сяўба ў раёне?».

Замест таго, каб арганізаваць калгаснікаў на сканчэнне сяўбы, райзя рассылае дырэктывы.

Дрэнная арганізацыя працы, нізкая працоўная дысцыпліна з'явіліся вялікім тормазам ў сяўбе, але аб гэтым многія старшыні калгасаў, а таксама і раённыя арганізацыі не падумалі. Калгас «Трынаццацігодзіе Кастрычніка» адстае па сяўбе. У брыгадзе С. Мялешка ёсць 75 працаздольных калгаснікаў, а на работу выходзяць толькі 12 чалавек і то ў 11—12 гадзін раніцы, астатнія калгаснікі прагульваюць. Цягавая сіла ў брыгадзе скарыстоўваецца напалову.

Такое-ж становішча і ў калгасе «Чырвоная Беларусь», Чыжэвіцкага сельсовета. У калгасе «Звязда» кожную раніцу мітусня. Брыгадзіры і сам старшыня калгаса Гарачка на работу выходзяць на дзве гадзіны пазней калгаснікаў, а ў гэты час калгаснікі не ведаюць, што рабіць. Нарады, як правіла, даюцца раніцою, перад выхадам на работу. У калгасе 58 гаспадарак, а на работу выходзіць толькі 26 чалавек. Старшыня калгаса звыкся з такім становішчам, патурае лодырам. Аб сацыялістычным спаборніцтве калгаснікі не ведаюць.

Ёсць у раёне і такія калгасы, дзе сяўба праходзіць самапёкам, а брыгадзіры і старшыні калгасаў на полі не бываюць. Возьмем калгас «Маяк сацыялізма», Доўгаўскага сельсовета. Тут дайшло да таго, што брыгадзір Спешыц купіў сабе каня і засявае прысядзібныя ўчасткі. Выходзяць на работу ў калгасе позна, а такія калгаснікі, як Герасіменя Х. і Васюкевіч А., самавольна пайшлі ў адыходніцтва.

Апрача таго, што калгас адстае з сяўбой, тут на якасць работы не звяртаюць увагі. Работу ад калгаснікаў брыгадзір прымае не пасля яе выканання, а авансам.

Адсутнасць працоўнай дысцыпліны, дрэнная арганізацыя працы прывялі да таго, што ў калгасе «Чырвоны шлях», Чырвонавозерскага сельсовета, у пагоні за колькасцю засяваюць як папала. Брыгадзір Прышчып два гектары ільну засеяў на няўгноенай глебе. Апрача гэтага пасеяны лён забаранавалі граблямі. Пустазелле пачало заглушаць усходы ільну.

Усе гэтыя парушэнні праходзяць міма сельсоветаў. Раённыя арганізацыі таксама не прынялі ніякіх мер, каб мабілізаваць калгаснікаў на хутчэйшае сканчэнне сяўбы.

Д. МАЛЕВІЧ.

СТАРШЫНЯ НЕ БЫВАЕ НА ПОЛІ

Калгас імя Красіна самы буйны ў Губінкім сельсавеце. Будакашалеўскага раёна. Тут ёсць усе магчымасці правесці веснавую пасеўную кампанію своечасова і добраякасна.

Аднак, калгас вельмі адстае па сяўбе. Яшчэ горш абстаіць справа з якасцю сяўбы.

У кожнай брыгадзе на ворыве калгаснікі рабілі амат агрэхаў, дрэнна правозілі баранаванне. Вельмі дрэнна зараз сеюць—зноў робяць агрэхі, дрэнна заддзелваюць насенне.

Напрыклад, у брыгадзе № 4 (брыгадзір Каляскоў) сеяльшчык Самардзякоў у часе сяўбы пшаніцы пралускаў сеялкай вялікія агрэхі. Так пасеяна ў гэтай брыгадзе ўся пшаніца.

Ні інспектары па якасці, ні старшыня калгаса Крупікаў не сочаць за якасцю сяўбы. Старшыня-ж калгаса наогул не можа сачыць за ходам сяўбы, бо ён не бывае на полі.

Селькор К.

НА СХОДЗЕ АКТЫВА РАБОТНІКАЎ МАСТАЦТВАЎ

За ўчарашні дзень рад таварышоў (Барысевіч, Літвінаў, Зораў, Модэль, Фрыдман і інш.) у сваіх выступленнях імкнуліся ўскрыць прычыны дрэннай работы Кіраўніцтва па справах мастацтваў, назваць рэчы сваімі імёнамі. Яны гаварылі аб тым, што ў кіраўніцтве панае благадушнасць, самасупакоенасць і самастрахоўка. Усё гэта адчуваецца і ў тэатрах і на іншых участках мастацтваў. Аднак, у папярджанне сваіх зусім правільных вываадаў яны чамусьці прывялі пераважна факты «гістарычнай» даўнасці. На фронце мастацтваў ворагі яшчэ не выкрыты да канца. Дунец, Сташэўскі, Квапінскі, Зарэнкі і інш. ворагі народу дзе-нізе пакінулі свае карэнні. Але ў спрэчках паасобныя прамоўцы, падкрэсліваючы гэта, не назвалі чамусьці ні аднаго прозвішча.

Іншыя прамоўцы ўдаралісь ў школьную крайнасць, сцвярджаючы, што на важнейшых участках мастацтваў — супяльныя прарывы і тупікі.

Мастацкі кіраўнік БДТ-2 т. Дарвішаў у сваёй прамове фактычна стаў на шлях прыніжэння крытыкі, на шлях ухілення ад канкрэтных праяўленняў класавай барацьбы ў мастацтве. Зусім праў т. А. Александровіч, які ў сваім выступленні, выказаўшы думку схода, раскрытыкаваў такую пазіцыю т. Дарвішава.

Вузкае дзяляцтва, абыход вострых пытанняў, аналітычнасць і агульнасць адчуваліся ў прамовах Заборава, Дабравольскага, Бяссмертнага і інш.

Зусім мала на сходзе ўдзяляецца ўвагі рабоце Тэатра оперы і балета. Між тым становішча рэпертуара, падрыхтоўкі кадраў і іншыя бакі гэтага выключна важнага тэатра павінны быць падвергнуты суровай крытыцы з тым, каб забяспечыць карэннае паляпшэнне яго работы.

Учора, як і на ранейшых пасяджэннях актыва, падкрэслівалася, што ў рабоце Кіраўніцтва па справах мастацтваў зусім закінуты ўчастак — калгасна-соўгасныя тэатры, якімі фактычна ніхто не кіруе і творчай дапамогі ім не аказвае.

Рад прамоўцаў гаварыў аб буйнейшых прарывах у музыкальных справах. На гэтым участку асабліва моцна адчуваецца шкодная дзейнасць нацдэмаўскага і трацкісцкага ахвоспя.

На сходзе толькі паміж іншым закранаюцца пытанні работы кіно. Да рэчы, з работнікаў кіномастацтва на сходзе амаль ніхога няма.

Сёння — працяг спрэчак.

Ал. ЛЕБЕДЗЕЎ.
П. КАВАЛЁЎ.

У НАРКАМАЦЕ АБАРОНЫ

Пастановай урада прызнана неабходным стварыць у ваенных акругах ваенныя саветы, а ў вайсковых часцях, кіраўніцтвах і ўстановах РСЧА — інстытут ваенных камісараў.

Пастановай урада першым намеснікам народнага камісара абароны назначан маршал Совецкага Саюза тав. Егораў А. І. Тав. Егораў А. І. Наркаматам абароны вызвалены ад пасады начальніка Генеральнага штаба.

Начальнікам Генеральнага штаба РСЧА назначан камандарм 1-га ранга тав. Шапашнікаў Б. М.

Камандарм 1-га ранга тав. Якір І. Э. назначан камандуючым войскамі Ленінградскай ваеннай акругі.

Маршал Совецкага Саюза тав. Тухачэўскі М. Н. назначан камандуючым войскамі Прыволжскай ваеннай акругі (БЕЛТА).

ЗАКОНЧЫЎСЯ ЎСЕСАЮЗНЫ ШАХМАТНЫ ЧЭМПІЯНАТ

ТБІЛІСІ, 11 мая. (БЕЛТА). Закончыўся праходзіўшы ў Тбілісі з 13 красавіка па 11 мая ўсесаюзны шахматны чэмпіянат.

10 мая быў сыгран апошні тур.

Аб'яўлены канчатковыя вынікі чэмпіянату.

Першае месца і званне чэмпіёна Совецкага Саюза па шахматах заваяваў майстар Левенфіш, які набраў 12,5 ачкоў з 19 магчымых. Другое і трэцяе месцы падзялілі Рагозін і Канстанцінопальскі — 12 ачкоў, чацвертае месца заняў Макагонаў — 11,5.

АНТЫРЭЛІГІЙНАЙ ПРАПАГАНДАЙ НЕ ЗАЙМАЮЦЦА

Палессе ў мінулым — гэта суцэльная цемра і бескультур'е. Таму тут больш чым дзе знаходзілі сабе глебу рознага роду рэлігійныя забабоны.

За гады совецкай улады Палессе стала непазнавальным. Калгасны лад у вёсцы знішчыў назаўсёды жабрацтва і галечу. Калгаснікі будуюць заможнае жыццё. Разам з паляпшэннем дабрабыту працоўных расце і развіваецца культура, новы быт. Гэтым самым нанесен рашучы ўдар рэлігійнаму дурману. Сярод працоўных Палесся выраслі новыя людзі, якія назаўсёды пакончылі з рэлігійнымі забабонамі, з верай у «цуды божаскія» і самага неіснуючага бога.

Але было-б няправільна думаць, што рэлігійныя перажыткі ў свядомасці насельніцтва поўнасцю ўжо ліквідаваны. Думаць так — значыць не разумець і не бачыць сапраўднага становішча. Рэлігійныя забабоны яшчэ моцна карэняцца ў свядомасці адсталых груп працоўных, а гэтым і карыстаецца класавы вораг. Таму барацьба з гэтымі забабонамі павінна працягвацца без малейшага паслаблення.

Між тым становішча антырэлігійнай прапаганды ў раёне Мазырскай акругі сведчыць аб поўным забыцці з боку партыйных, комсамольскіх і профсаюзных арганізацый гэтага важнейшага ўчастка палітычнай работы ў масах. Наглядным доказам гэтага можа служыць факт развалу раённых советаў бязбожнікаў. Яны разгубілі свой актыў і не паказваюць ніякіх прызнакаў работы. А раённыя камітэты партыі зусім забылі аб іх існаванні. У выніку антырэлігійная прапаганда сярод насельніцтва зусім заглохла. Гэта выкарыстоўваюць у сваіх мэтах рознага роду царкоўнікі і ўзмацняюць сваю дзейнасць. У вёсцы Сімаковічы, Лельчыцкага раёна, царкоўнікі вядуць сярод калгаснікаў агітацыю за адкрыццё царквы. У вёсцы Акопы, Нараўлянскага раёна, яны распаўсюдзілі пісьмо, у якім запалохвалі калгаснікаў «божай карай».

Нярэдкі выпадкі, калі царкоўнікі распаўсюджваюць свой рэлігійны ўплыў праз бацькоў на дзяцей, прымушаючы іх наведваць царкву і адпраўляць рэлігійныя абрады. Не так даўно ў Тураўскім раёне меў месца факт «хрышчэння» 30 дзяцей школьнага ўзросту, у тым ліку адной піонеркі. У вёсцы Тураны, Мазырскага раёна, поп узяў пад свой уплыў нават асобных актывістаў. Так, у дні рэлігійнага свята «вялікдзень» адзін з калгасных брыгадзіраў Фешчанка прадаставіў папу сваю хату для адпраўлення ў ёй рэлігійных абрадаў. А ў Калінкавічах, таго-ж Мазырскага раёна, на повазу клерыкалаў аказаліся нават комуністы. Так, старшыня гарпо, член партыі Падрашка дапусціў па гарадскую забойную пляцоўку рэзніка, які прыгатаўляў там для веруючых яўрэяў кашэрнае мяса.

Што-ж робяць партыйныя, комсамольскія і профсаюзныя арганізацыі, каб супрацьпаставіць рэлігійнаму дурману царкоўнікаў марксісцка-ленінскі светапогляд, комуністычны ўплыў на масы? Зусім нічога. Антырэлігійная прапаганда не была разгорнута як след сярод насельніцтва нават у дні рэлігійнага свята «вялікдзень». Пасланыя райкомамі партыі ў сельсоветы прапагандысты і агітатары для правядзення антырэлігійнай работы ў пэлым радзе месц нічога карыснага не зрабілі. Больш таго, асобныя з іх, напіўшыся п'янымі, поўнасцю сябе скампраметавалі ў вачах насельніцтва. Так, мырактар калінкавіцкай канторы «Белплодгародніны» Кончыц, які быў паслан мазырскім райкомам партыі ў Нохаўскі сельсовет для правядзення антырэлігійнай работы, заняўся там п'янствам і ніякай работы не правёў. Разам з старшынёй сельсовета Фёдаравым, апошні, напіўшыся, распачаў з калгаснікамі бойку, у часе якой збіў трох чалавек.

Чым, як не недастатковай антырэлігійнай прапагандай многімі партыйнымі работнікамі можна тлумачыць усе гэтыя факты. З гэтай недастатковай трэба рашучым чынам змагацца. Раённыя і акруговыя камітэты партыі павінны паварушць сваю ўвагу да антырэлігійнай работы, памятаючы, што антысовецкія людзі, заклятыя ворагі народу імкнуцца выкарыстоўваць веруючых у сваіх гнусных, шкодніцкіх мэтах.

Р. ФРАЛОЎ.

НА КАГАНОВІЦКАЙ РАЙПАРТКАНФЕРЭНЦЫІ

Учора на ранішнім пасяджэнні канферэнцыі было праведзена тайнае галасаванне дэлегатаў на гарадскую партыйную канферэнцыю. Усяго абрана 125 дэлегатаў. На гэтым-жа пасяджэнні абмяркаваны кандыдатуры ў спіс для тайнага галасавання членаў рэвізійнай камісіі. З высунутых 13 чалавек у выніку абмеркавання асталося 10. Тайным галасаваннем рэвізійная камісія абрана ў складзе пяці чалавек.

На вячэрнім пасяджэнні тайным галасаваннем былі таксама абраны дэлегаты на гарадскую партканферэнцыю з дарадчым голасам.

На гэтым-жа пасяджэнні выступіў сакратар ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіч. Тав. Шаранговіч звярнуў увагу канферэнцыі на выхаванне і вылучэнне новых кадраў. Ён звярнуў увагу на задачы КП(б)Б ва ўмацаванні сельскай гаспадаркі і работу на культурным фронце.

Учора канферэнцыя закончыла сваю работу.

Ц. ФРЫД.

АДКРЫЛАСЯ АРШАНСКАЯ ПАРТКАНФЕРЭНЦЫЯ

ОРША. Учора адкрылася 5-я аршанская раённая партыйная канферэнцыя. На першым пасяджэнні вырашаны арганізацыйныя пытанні. Сёння партыйная канферэнцыя слухае справаздачны даклад сакратара райкома тав. Соскіна.

АСТАПЕНКА.

ПЕРШЫ ВЫПУСК ГЕОЛАГАЎ

Учора пачаліся дзяржаўныя экзамены студэнтаў геолага-геаграфічна-глебазнаўчага факультэта **Беларускага дзяржаўнага універсітэта.** У гэтым годзе ўпершыню ў БССР універсітэт выпускае высокакваліфікаваных спецыялістаў па геалогіі і глебазнаўству, якія заканчваюць пяцігадовы курс універсітэцкага навучання.

Экзаменацыйная камісія ў складзе акадэміка **Афанасьева** (старшыня), рэктара БДУ праф. **Ермоленка,** праф. **Жэрмундскага** і інш. учора за тры гадзіны работы прапусціла 10 чалавек. З іх 6 чал. — тт. **Врублеўская, Козак, Грынінскі, Крук, Пучкоў і Юхнавец** атрымалі выдатныя адзнакі. Астатнія 4 чал. — здавальняючыя.

Камісія адзначыла здавальняючую падрыхтоўку выпускаемых для самастойнай навукова-даследчай і педагагічнай работы.

З 22 выпускаемых 5 чал. — лепшых выпускнікаў вучобы — будуць працаваць у Акадэміі навук Беларусі на навукова-даследчай рабоце. Астатнія будуць скарыстаны на рабоце ў Трэсце мінеральных будматэрыялаў, горнаразведчым кіраўніцтвам Беларусі, Кіраўніцтвам шасейных дарог і на педагагічнай рабоце ў сярэдніх навучальных установах Беларусі.

Ф. КАНСТАНЦІНАЎ.

ЗА РУБЯЖОМ

СТАНОВІШЧА Ў КАТАЛОНІІ

ПАСЛЯ ТРАЦКІСЦКА-ФАШЫСЦКАГА ПУТЧА

ВАЛЕНСІЯ (горад на ўсходнім узбярэжжы Іспаніі, часовая рэзідэнцыя Ўрада), 10 мая. (БЕЛТА). «Аора» (орган федэрацыі аб'яднанай социялістычнай моладзі) у перадавым артыкуле зноў патрабуе роспуску трацкісцкай арганізацыі «ПОУМ» і маладзёжнай трацкісцкай арганізацыі не толькі ў Каталоніі, але і ва ўсёй Іспаніі. Газета ўказвае, што ўдзел трацкістаў у выступленнях асобных анархісцкіх груп сведчыць аб тым, што трацкісты прапікалі і ў нацыянальную канфедэрацыю працы.

***

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 10 мая. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас у тэлеграме з Барселоны перадае аб поўнай захапленні сустрэчы, аказанай насельніцтвам каталонскай сталіцы генералу Посас, назначанаму іспанскім ураадам на пасаду камандзіра 4-й дывізіі і выконваючаму функцыі саветніка па справах абароны ў каталонскім урадзе.

***

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 10 мая. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Эспань, камандуючы ўзброенымі сіламі Каталоніі генерал Посас зрабіў журналістам наступную заяву: «Я не пазыходжу з пралузтай думкай ні да адной арганізацыі, якой-бы яна ні была. Я толькі супроць фашыстаў. Што датычыць рэарганізацыі каталонскай арміі, я маю намер ажыццявіць адзінства камандавання. Армія павінна быць і будзе антыфашысцкай».

***

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 11 мая. (БЕЛТА). Іспанская комуністычная партыя правядзіць рад мітынгаў у сувязі з падзеямі ў Каталоніі. Як паведамляе орган компартыі Францыі «Юманіт», на мітынгу ў Валенсіі, сабраўшым выключна шматлюдную аўдыторыю, выступілі Хозэ Дыяс, Даларэс Ібаруры, міністр народнай асветы Эрнандэс, міністр земляробства Урыбе і прадстаўнік аб'яднанай социялістычнай партыі Каталоніі Вальдэс.

Генеральны сакратар іспанскай компартыі Хозэ Дыяс указаў, што калі-б былі праведзены меры, якіх компартыя даўно патрабуе, а іменна: роспуск трацкісцкай арганізацыі «ПОУМ» і арышт яе лідэраў, сёння, быць можа, не прышлося-б аплакваць афіры крывавых падзей у Каталоніі.

Дыяс напомніў, што правакатары, якія узначальваюць «ПОУМ», систематычна, на працягу многіх месяцаў, імкнуцца дыскрэдытаваць каталонскі ўрад і пэнтральны іспанскі ўрад. Трацкісцкія злачынцы ставяць сабе мэтай скінуць урад рэспублікі.

Заканчваючы сваю прамову, Дыяс указаў, што рэспубліканскі ўрад, які здолеў аднавіць парадак, павінен пайсці да канца і распусціць арганізацыі, якія прымалі ўдзел у мяцежных выступленнях у Барселоне.

ЭВАКУАЦЫЯ ЖАНЧЫН І ДЗЯЦЕЙ З БІЛЬБАО

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 10 мая. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас перадае, што 2 тысячы дзяцей, жанчын і старыкоў эвакуіраваны з Більбао 8 і 9 мая.

Эвакуіруемыя адбываюць з Більбао большай часткаю на французскіх і англійскіх параходах, якія ідуць у суправаджэнні ваенных караблёў гэтых краін.

***

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 11 мая (БЕЛТА). Так званы «ўрад» мяцежнікаў апублікаваў другі ўказ франка-англійскаму ўраду з пратестам супроць эвакуацыі жанчын і дзяцей з Більбао. Франко нападае на Англію за сапраўднасць эвакуацыі і паўтарае сваю прапанову стварыць для эвакуіруемых «нейтральную зону».

Першае мая за рубяжом. НА ЗДЫМКУ: першамайская дэманстрацыя адзінага фронта ў Парыжы. Справа на транспаранце надпіс: «Мы хочам работы». (СФ).

МАНЕЎРЫ ЯПОНСКАЙ ВАЕНШЧЫНЫ

Не гледзячы на поўнае паражэнне на выбарах у японскі парламент, урад Хаясі не збіраецца падаваць у адстаўку і ўпарта чапляецца за ўладу. Ваенныя колы, якія дырыжыруюць палітыкай японскага ўрада, не хочуць здаваць сваіх пазіцый і адступіць перад націскам грамадскай думкі.

Ваенны міністр Сугіяма ў апошні час вязае ад імя ваеншчыны ўзмоцненыя перагаворы з главой урада Хаясі, заахвочваючы яго да няўступчывасці, да далейшай барацьбы з грамадскімі коламі. А націск гэтых колаў на ўрад прадаўжаецца.

Правадыр партыі Мінсейто (партыі зямельнай арыстакратыі і прамысловага капітала) Маціда ў сваёй прамове на канферэнцыі новых дэпутатаў парламента паставіў пытанне ад адстаўцы ўрада. На гэтым-жа настойвае асноўная буржуазная партыя парламента—Сейюкай. Старшыня социял-дэмакратычнай партыі Сякай Тайсюто Абе ў сваёй прамове патрабаваў неадкладнай адстаўкі ўрада Хаясі.

У адказ на гэтыя патрабаванні ўрад Хаясі правядзіць рад манеўраў, каб утрымацца ва ўладзе. Адным з такіх манеўраў з'яўляецца залва міністра замежных спраў Сато, які выказаў жаданне «весці палітыку дружбы з Кітаем, СССР, ЗША і Англіяй». Японскі друк, выказваючы сумненне на повазу шчырасці «добрых намераў» міністра, задае яму заканаае пытанне: якім чынам Сато мяркуе правядзіць сваю палітыку ў цяперашняй трывожнай абстаноўцы?

Адным з такіх манеўраў, які мае мэтай умацаванне глебы пад нагамі, з'яўляецца таксама перагаворы паміж Японіяй і Англіяй. Гэтыя перагаворы, па вестках друку, датычаць дзялёжкі Кітая. Японія патрабуе ад Англіі прызнання Паўночнага Кітая сферай японскага ўплыву і ўзамен абяцае спыніць сваё наступленне ў Пэнтральным і Паўднёвым Кітаі, дзе асабліва вялікія англійскія ўкладанні.

Сэнс гэтых перагавораў у тым, што, аддаючы Японіі Паўночны Кітай, Англія тым самым фактычна благаслаўляе новую ваенную авантуру японскіх імперыялістаў.

Недарма японска-англійскія перагаворы выклікалі трывогу ў Кітаі. Кітайскія газеты разглядаюць магчымае англа-японскае пагадненне, як здзелку за кошт Кітая, якая пагражае адзінству краіны.

Такім чынам, не гледзячы на волю народу, які галасаваў на выбарах супроць вайны, японская ваеншчына пралаўжае штурхаць краіну на шлях небяспечных авантур, якія пагражаюць Японіі самымі цяжкімі вынікамі.

Японія рыхтуе новае наступленне на Паўночны Кітай

ШАНХАЙ (буйнейшы пэнтр Кітая), 11 мая. (БЕЛТА). Згодна паведамлення газеты «Шышысіньбао», японскае камандаванне рашыла паслаць у Манчжурыю дзве новыя дывізіі і адну ў Цыньдао (Паўночны Кітай). Паволле слоў газеты, японская ваеншчына намячае арганізаваць буйныя беспарадкі ў правінцыі Хэбэй і Шаньдунь, каб, пад выглядам абароны жыцця і маемасці японскіх падданых, пачаць новае ўзброенае наступленне на Паўночны Кітай.

За апошнія тры месяцы японцамі завербавана і адпраўлена ў Манчжурыю на работы па ўзвядзенню ўмацаванняў звыш 160 тысяч кітайскіх кулі.

„Мірнае" заваяванне Данцыга гітлераўцамі

ВАРШАВА (сталіца Польшчы), 10 мая. (БЕЛТА) Агенцтва Экспрэс паведамляе, што гітлераўцам у Данцыгу (вольны горад, які знаходзіцца пад пратэктаратам Ліг нацый) удалося атрымаць у фолькстагу (парламенце) большасць, неабходную для «легальнага» ажыццяўлення пажаданых ім змен канстытуцыі. Гэтым поспехам гітлераўцы абавязаны капітуляцыі некалі апазіцыйнай партыі нямецкіх нацыяналістаў у Данцыгу, пастанавіўшых далучыцца да гітлераўскай фракцыі ў данцыгскім фолькстагу.

***

ВАРШАВА, 11 мая (БЕЛТА) Польскае агенцтва паведамляе, што ў бліжэйшыя дні трэба чакаць роспуску партыі нямецкіх нацыяналістаў у Данцыгу.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

ПАЎНОЧНЫ ФРОНТ

Як паведамляе агенцтва Рэйтар, 9 мая пасля поўдня рэспубліканскія войскі, падтрыманыя танкамі і артылерыяй, захапілі на біскайскім фронце значную частку тэрыторыі, пакінутай імі 8 мая.

Як паведамляе газета «Дэйлі геральд», 8 мая мяцежнікі панеслі ў часе сваіх масавых атак цяжкія страты.

Як паведамляе кансерватыўная газета «Дэйлі экспрэс», у Більбао (галоўны горад Баскскай аўтаномнай вобласці), у адказ на зварот комуністычнай партыі, заклікаўшай да мабілізацыі ўсяго насельніцтва горада на работу па абароне, тысячы людзей запісваюцца ў рабочыя батальёны для рыцця акопаў і ўзвядзення ўмацаванняў вакол горада.

Згодна афіцыяльнага паведамлення камітэта абароны Більбао, пераданага па радыё 10 мая, мяцежнікі ў гэты дзень прадаўжалі ярасное наступленне. Аперацыі адбываліся на фронце даўжынёй больш чым 30 кілометраў. Бой цягнуўся ўвесь дзень. Перайшоўшы ў контрнаступленне, рэспубліканцы паспяхова атакавалі гару Сольюва. Адным з рэспубліканскіх атрадаў заняты найбольш высокія вяршыны масіва. Гэта аперацыя поўнасцю расстроіла планы праціўніка, які панёс цяжкія страты. Наступленне мяцежнікаў звялося да назначнага прасоўвання ў раёне Рыойтыя.

Рэспубліканскія войскі панеслі паражэнне праціўніку каля Уруменды. Мяцежнікі страцілі больш 1000 чалавек.

Фашысцкая авіяцыя бязупынна рабіла палёты над рэспубліканскімі лініямі, але не змагла выцесніць рэспубліканскія войскі з іх пазіцый.

11 мая мяцежнікі імкнуліся выцесніць рэспубліканскія войскі з Рыгойтыя, але энергічнае супраціўленне рэспубліканцаў прымусіла праціўніка адступіць з цяжкімі стратамі. Рады мяцежнікаў былі скошаны агнём кулямётаў і авіяцыі.

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

Згодна паведамлення, апублікаванага ў Мадрыдзе, мяцежнікі пачалі эвакуацыю важнай у стратэгічных адносінах вёскі Кагальюдо за 35 кілометраў на поўнач ад Гвадалахары.

На паўднёвым участку фронта ўрадавыя войскі прасунуліся на 4 кілометры ўдоўж дарогі ў Толедо.

Як паведамляе агенцтва Гавас з Мадрыда, на харамскім фронце (на паўднёвы ўсход ад Мадрыда) у сектары Мората дэ Тахунья рэспубліканскія войскі раніцой 10 мая, адбіўшы атаку мяцежнікаў, зрабілі энергічную контратаку і выцеснілі праціўніка з некаторых яго пазіцый.

Згодна афіцыяльнага паведамлення іспанскага ваеннага міністэрства, перададзенага па радыё ўвечары 10 мая, фашысцкая авіяцыя зноў бамбардыравала Мадрыд. У часе бамбардыроўкі забіта некалькі чалавек.

У сектары Толедо (на поўдзень ад Мадрыда) днём 10 мая рэспубліканцы прасунуліся наперад на адзін кілометр ад пазіцый, занятых імі напярэдадні, на ўсход і захад ад дарогі Архес — Толедо. Бай прадаўжаліся на працягу ўсёй другой паловы дня да наступлення ночы. Рэспубліканская артылерыя абстрэльвала ваенныя аб'екты Толедо. (БЕЛТА).

АГІРЭ—ГАЛОЎНАКАМАНДУЮЧЫ БАСКСКАЙ АРМІІ

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 10 мая (БЕЛТА). Як перадаюць з Більбао, апублікаваў дэкрэт аб назначэнні галавы баскскага ўрада Агірэ галоўнакамандуючым баскскай арміі. У Агірэ будуць два памочнікі — ваенныя спецыялісты: палкоўнік дэ Монто і маёр дэ Арамбары.

НОВЫЯ МАНЕЎРЫ ФАШЫСЦКАЙ ГЕРМАНІІ

І. ОСІПАЎ.

Нядаўнія хвалявыя прамовы і запэўненні фашысцкіх лідэраў аб «поспехах» германскай эканомікі, аб пераможным шэствіі па шляху незалежнасці ад крызісаў сусветнай гаспадаркі і т. д. змяніліся новым тонам.

Германскі міністр народнай гаспадаркі і старшыня Рэйхсбанка Шахт, знаходзячыся ў Бруселі, заявіў, што эканамічнае паляпшэнне немагчыма без міжнароднага супрацоўніцтва, і аўтаркія (поўная гаспадарчая самастойнасць) ні ў якой меры не з'яўляецца ідэалам для Германіі. Апошняя, моў, гатова прымаць удзел у эканамічнай канферэнцыі, якая стварыла-б умовы для міжнароднага свабоднага тавараабмену. Шахт падкрэсліў, што для гэтага Германія павінна толькі атрымаць... доўгатэрміновыя крэдыты.

У сваёй прамове ў Мюнхене той-жа Шахт выказаўся яшчэ больш акрэслена, заявіўшы, што вопыты з абмежаваннем увозу сыравіны не апраўдалі сябе. Нарэшце, Гітлер у часе свайго спаткання з англійскім панцыфістам Ленсберы ў другой палове красавіка выказаў згоду Германіі на ўдзел у міжнародным эканамічным і палітычным супрацоўніцтве.

Чым тлумачыцца гэта рэзкая змена тону і гэтыя новыя, зразумела, хлуслівыя, «нацыфісцкія» манеўры фашысцкай Германіі?

Яны тлумачацца, у першую чаргу, тымі велізарнымі труднасцямі, з якімі сутыкнуліся фашысцкія заправілы пры правядзенні праграмы шалёных узбраенняў і фарсаванай падрыхтоўкі да вайны. За час з 1933 года па 1936 год германскі фашызм выдатраваў на ўзбраенне велізарную суму, вызначаемую, прыкладна ў 30 мільярдаў марак. Ваенныя расходы пагłынаюць звыш трох чвэртак бюджэтных расходаў Германіі. Сума ў 30 мільярдаў марак зусім не з'яўляецца перапавялічанай, хоць дакладных даных і няма, бо ў фашысцкай Германіі даўно ўжо не публікуецца ні агульны, ці ваенны бюджэт. Іншаземныя крыніцы прыводзяць наступнае размеркаванне гэтых 30 мільярдаў марак, ушоўшых на падрыхтоўку вайны: узбраенне для розных відаў войск — 7 мільярдаў марак; патроны і снарады, уключаючы і мабілізацыйныя запасы — 7,5 мільярдаў марак; ваеннае будаўніцтва — 10 мільярдаў марак; утрыманне арміі і інш. расходы — звыш 5 мільярдаў марак.

Дзе-ж крыніцы фінансавання вайны, адкуль германскі фашызм выкачаў гэту велізарную суму, патрачаную на ўзбраенні? **Германскі фашызм узбройваецца за кошт небывалага зніжэння жыццёвага ўзроўню працоўных мас.** Не гледзячы на тое, што па афіцыяльных даных індэкс прамысловай прадукцыі (пры велізарнай вазе ваеннай вытворчасці) у 1936 годзе складаў 107 проц. (1928 г. прынят за 100), фонд заработнай платы ў 1936 годзе склаў толькі 75,3 проц. фонда заработнай платы 1928 г. Сярэдняя заработная плата ў Германіі нават па афіцыяльных даных зменшылася на 20 проц. параўнальна з 1929 годам. Тут гутарка ідзе аб **намінальнай** заработнай плаце. Калі-ж улічыць велізарнае павышэнне цэн, у асаблівасці на прадукты харчавання, якіх становішча ўсё менш (у сакавіку 1937 г. параўнальна з летам 1932 года цэны на сала падняліся на 37 проц., на ветчыну— на 29 проц., на гавядзіну — на 66 проц., на маргарын—на 68 проц., на яйкі—на 62 проц. і т. д.) і прыняць пад увагу велізарныя вычэнні з заработнай платы, то малюнак атрымаецца дастаткова ясны.

Надзвычайна вырас падатковы цяжар. У 1932—33 годзе падатковыя паступленні далі 6,6 мільярдаў марак, а ў 1936—37 годзе яны складаюць ужо 11,8 мільярдаў марак. У першым выпадку падаткі складалі 11,9 проц. усяго народнага даходу, у другім — 19,1 проц. Пры дапамозе падатковага прэса германскі фашызм выкачвае да 20 проц. усяго народнага даходу. Асабліва вялікі рост паказваюць тыя падаткі, якія падаюць на працоўныя масы. Так, падаткі на маемасць зменшыліся параўнальна з 1932—33 годам, а падаткі на зарплату павялічыліся больш чым удвая. Падаткі на гандлёвыя абароты, перакладваемыя на спажыўца, таксама павялічыліся на 70 з лішнім процантаў, падаткі на спажыванне павялічыліся амаль на 50 проц. і т. д.

А ў той-жа час ваенныя прамыслоўцы атрымліваюць небывалыя прыбыткі. Чысты прыбытак двух тысяч акцыянерных таварыстваў павялічыўся з 1,3 мільярдаў марак у 1935 годзе да 2 мільярдаў марак у 1936 годзе. Прывядзем некаторыя параўнаўчыя даныя аб прыбытках ваенных трэстаў у 1932—33 годзе і ў 1935—36 годзе. Прыбытак вядомага хімічнага трэста «І. Г. Фарбен Індустры» складаў 5 год назад 49,5 мільёна марак, а зараз — 56,2. «Ферэйнігтэ Штальвэрке» — 14,9 мільёна марак і 48,3 мільёна марак, Крупа — 3 мільёны страт і 14,3 мільёна марак прыбытку. Заводы «Опель» атрымалі ў 1932—33 г. 0,8 мільёна марак страт, а летась 19,7 мільёна марак прыбытку.

Фінансаванне вайны правядзіцца таксама за кошт ограблення ўкладчыкаў ашчадных кас і размяшчэння прымусовых пазык праз забранне буйных сум з страхавых таварыстваў і т. д. У прыватнасці, са зберажэнняў насельніцтва фашысцкі ўрад забраў 2,6 мільярдаў марак.

Германская праграма ўзбраенняў, намечаная законам ад 16 сакавіка 1935 года, ужо выканана са «зліткам». Замест 12 карпусоў сфармавана 13 карпусоў, зараз ствараецца двухмільённая армія на аснове дэталізаванага закона аб двухгадовай ваеннай службе, узмоцненымі тэмпамі выконваецца ваенна-морская праграма.

Аднак, іменна цяпер германскі фашызм, больш чым калі-б там ні было, адчувае патрэбу ў новых крыніцах фінансавання вайны. Германскі фашызм зусім не лічыць, што ён ужо поўнасцю падрыхтаваны да вайны і ліквідаваў унутраныя слабасці сваёй велізарнай ваеннай машыны.

У сувязі з няхваткай афіцэрскіх кадраў і абучаных рэзерваў для будучай вайны германскі фашызм правядзіць узмоцненымі тэмпамі ваенную падрыхтоўку і перападрыхтоўку ўсяго насельніцтва. Гэта звязана з далейшым разгортваннем снабжэння арміі тэхнічным узбраеннем і павелічэннем ваенных расходаў.

Не вырашана праблема **сыравіны і харчоў.** Германскі народ галадае. Ужо зараз, да вайны, у Германіі ўстаноўлена сістэма арганізаванага голаду па ўзорах часоў сусветнай вайны. Абвяшчэнне на Нюрэнбергскім фашысцкім з'ездзе ў 1936 г. другога чатырохгадовага плана не азначала выкананне першага чатырохгадовага плана, а, наадварот, — прызнанне таго факта, што гэты першы чатырохгадовы план праваліўся. Як вядома, гэты «першы план» афіцыйнымі коламі прызначаўся для забеспячэння Германіі «харчовай незалежнасці». Але па сканчэнні чатырох год Гітлер прызнаў, што гэтай незалежнасці дасягнуць нельга, бо з германскай глебы больш нічога нельга выціснуць, трэба перайсці да «сыравіннай чатырохгодкі» і тужэй зацягнуць кушакі. «Лозунг — гарматы замест масла — астаецца ў сіле».

Ужо першы вопыт правядзення «сыравіннай чатырохгодкі» паказвае яе провал. Штучнае насаджэнне розных сурагатаў звязана з дазарганізацыяй народнай гаспадаркі, з велізарнымі затратамі. Штучны бензін, напрыклад, абходзіцца ўдвая даражэй прывазнога, штучны каучук — у сем раз даражэй прывазнога. Развіццё і заахвочванне вытворчасці сельскагаспадарчай сыравіны, неабходнай для прамысловасці, паштурхоўваецца на непераможаныя цяжкасці ў сувязі з тым, што пасеўная плошча і без таго вельмі скарачаецца. Не гледзячы на голад у краіне, рэзка зніжан імпарт харчавання. Калі ў 1929 годзе было прывезена на 3.823 мільёнаў марак харчовых тавараў, то ў 1936 годзе толькі на 996 мільёнаў марак. Адначасова рэзка ўзмацніўся імпарт стратэгічнай сыравіны. У 1933 годзе было завезена сыравіны на 1.367 мільёнаў марак, у 1936 г. — на 1.571 мільён марак. З 1929 па 1936 г. імпарт каучука павялічыўся на 67 проц., імпарт нафты павялічыўся ў 10 разоў.

Пры ўвозе сыравіны Германія сустракаецца зараз з новымі цяжкасцямі, звязанымі са зменамі ў агульнаэканамічнай канюнктуры. Раней, у часе разгару крызіса, цэны на сыравіну былі нізкія, рынкі збыту недастатковыя. Германія, як буйны імпарцёр, дыктавала сваю волю многім прадаўцам сыравіны, у асаблівасці — малым краінам. Яна выкарыстала гэта сваё становішча не толькі для эканамічнага, але і для палітычнага націску і вымагацельства ў адносінах малых краін. У асаблівасці гэта адносіцца да краін Паўднёва-Ўсходняй Еўропы. Яна ўстанавіла сістэму клірынга, г. зн. безнаяўных разлікаў, і павінна была расплачвацца сваімі прамысловымі таварамі за замежную сыравіну. У выніку рад малых краін аказаліся пакрыўджанымі крэдыторамі Германіі.

Зараз цэны на сыравіну рэзка павысіліся ў сувязі з пашырэннем рынкаў збыту стратэгічнай сыравіны. Краіны-прадаўцы сыравіны не хочуць ужо ісці на повазу германскіх знешнегандлёвых маніпуляцый. Германіі цяпер больш цяжка даставаць сыравіну, за яе трэба плаціць значна даражэй, чым раней, бо цэны на прывазную сыравіну 1936 г. па сакавік 1937 г. вырасла на 20 проц. і, галоўнае — за яе прыходзіцца плаціць наяўнымі.

Вось тыя прычыны, якія прымушаюць германскіх фашыстаў для падрыхтоўкі вайны ўзмоцнена шукаць грошай за граніцай. Залаты запас Германіі, складаўшы ў 1929 г. каля 3 мільярдаў марак, зараз поўнасцю вычарпан, у той час, як папяровы зварот вельмі вырас.

На 31 сакавіка ў 1937 г. залаты запас Рэйхсбанка склаў толькі 68 мільёнаў марак. Прымусовыя мерапрыемствы па пераводу ў Германію загранічных капіталаў, належачых немцам, хоць і суправаджаюцца пагрозамі пакарання смерцю, даюць мізэрныя вынікі. Астаецца новы наяжэнне жыццёвага ўзроўню германскага народу. Гэтым пляхам і працятвае ісці германскі фашызм. Але тут ён сустракаецца з велізарнымі небяспекамі унутранапалітычнага парадку. Незадаволенне ў краінэ расне і ўсё больш адкрыта праяўляецца знадворку. Аб гэтым гаворыць ужо тое, што германскаму фашызму прыпалося адкласці выбары ў «советы даверанных» на прадпрыемствах. Аб гэтым таксама сведчыць толькі-што закончыўшыйся працэс каталіцкіх арганізацый і тая акалічнасць, што фашысцкім органам прыходзіцца пускацца ў палеміку з «ныпікамі і крытыканамі» па пытанню аб невыносным цяжару ваенных выдаткаў.

Германскі фашызм, усё больш напружваючы ўнутраныя фінансавыя рэсурсы, з вялікімі цяжкасцямі падтрымлівае відзімасць фінансавага «добрабыту». Рост папяровага звароту, адсутнасць залатога забеспячэння, шматлікія штучныя мерапрыемствы, звязаныя з наяўнасцю рознага роду валют — «блакіраваная марка», «турысцкая марка», «экспартная марка», — дастаткова ясна выкрываюць усю хісткасць фінансавага будынку Трэцяй імперыі.

Не дзіўна, што лідэры фашысцкай Германіі за апошні час развіваюць такую шалёную актыўнасць па лініі пошукаў знешніх пазык і эканамічнай дапамогі звонку. Фашысцкая дыпламатыя нашчупвае ў Нью-Ёрку, Лондане і Парыжы магчымасці аказання Германіі эканамічнай дапамогі і прадастаўлення ёй доўгатэрміновых пазык. Каб расчысціць глебу і стварыць адпаведную «атмасферу давер'я», пускаюцца чуткі аб тым, што Германія шукае «перадышкі», адкладваючы джыццяўленне сваіх ваенна-агрэсіўных планаў, што фашысцкая Германія гатова на эканамічнае супрацоўніцтва з усім светам, не выключаючы і СССР. Для гэтай-жа мэты выпускаюцца на перадавую лінію дзелчы тыпу Шахта, якім замежная буржуазія больш верыць, чым заўзятым фашысцкім «звышдыпламатам» тыпа Рыбентропа.

Ясна, што прамова ідзе не аб «перадышцы», якой быццам-бы дабіваецца Германія, а аб новым ліхім манеўры, прызначаным для таго, каб пусціць пыл у вочы і дабіцца знешняй пазыкі. Аб Шахце можна сказаць словамі рускай прыказкі: «Глядзіць у рот, а лезе ў кішэню».

Новыя пазыкі, замежная дапамога патрэбны Германіі не для замаруджвання, а для фарсіравання падрыхтоўкі да вайны.

Англійскае і французскае золата, калі-б яно і было прадастаўлена Германіі, вельмі хутка звярнулася-б у Парыж і Лондан, але ўжо ў выглядзе гармат і аэра-хімічных бомб.

АБМЕРКАВАННЕ ПЫТАННЯЎ ТРЭЦЯГА ПЯЦІГАДОВАГА ПЛАНА

АБ ВЫТВОРЧАСЦІ БУДАЎНІЧЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ

У выніку двух пяцігодак Совецкая Беларусь ператварылася ў краіну індустрыяльную. Трэці пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі, несумненна, прадугледзіць далейшы рост прамысловасці. Апрача велізарнага прамысловага будаўніцтва, павінна быць, безумоўна, разгорнута ў яшчэ больших маштабах, чым гэта мела месца да гэтага часу, і комунальнае будаўніцтва.

Из гледзячы на вялікія дасягненні ў галіне вытворчасці будаўнічых матэрыялаў, гэта галіна прамысловасці ў сваім развіцці адстае, што прыводзіць да невыканання будаўніцтва ў вызначаныя тэрміны, пагаршае якасць і падаражае кошт будаўніцтва.

План трэцяй пяцігодкі павінен прадугледзець максімальнае развіццё вытворчасці будаўнічых матэрыялаў, галоўным чынам за кошт павышэння прадукцыйнасці існуючых заводаў, памятаючы ўказанне таварыша Сталіна на лютаўскім Пленуме ЦК ВКП(б) аб тым, што «ўсе нашы гаспадарчыя планы з'яўляюцца занижанымі, бо яны не ўлічваюць велізарных разерваў і магчымасцей, якія тояцца ў нетрах нашай народнай гаспадаркі».

Наяўнасць глін у БССР дазваляе ў дастатковай ступені развіць вытворчасць цэглы. Разам з колькасным ростам павінна быць вырашана пытанне і аб якасці выпускаемай цэглы. Трашчыністасць, нестандартнасць размераў выпускаемай нашай прамысловасцю цэглы не могуць быць цярпімы ў далейшым. Нарашце, надзвычайна важным пытаннем з'яўляецца выпуск аблiцовачнай і мастацкай цэглы. У многіх гарадах капіталістычных краін ужо даўно скарыстоўваюць у будаўнічай практыцы каляровую (шляхам сумесі мінеральных фарб) і іншых відаў аблiцовачную цэглу, якая надае цаглянаму будынку прыгожае архітэктурнае афармленне і адымае неабходнасць праводзіць аблiцовачныя работы, якія часта абыходзяцца надзвычайна дорага ў параўнанні з коштам усяго будаўніцтва. Таксама павінна быць вырашана пытанне аб пераводзе гаспадаркі глінаў з сезоннай на круглагадовую работу. Для гэтага неабходна некалькі рэканструяваць існуючыя заводы, расшырыўшы прыстасаванне штучных сушняў, і рабіць цэглу па спосабу сухога прэсавання. Пра апошняе мы пакуль шмат гаворым, але вельмі мала робім.

Вялікі рост павінна даць і вытворчасць вяжучых будматэрыялаў. На нашых будоўлях цэмент з'яўляецца асабліва дэфіцытным матэрыялам, вытворчасць якога зусім недастаткова забяспечвае патрэбы. Далейшае разгортванне будаўніцтва аднаму Крычаўскаму цэментнаму заводу непад сілу задаволіць, і таму важна неадкладна прыступіць да пабудовы другога цэментнага завода на базе шасцярэўскіх крэйд і іванаўскіх фэнелаў.

Вытворчасць вапны ў трэцяй пяцігодцы, апрача росту самой вытворчасці, трэба больш скансантраваць па лініі рэспубліканскай прамысловасці. Зусім ненармальным з'яўляецца тое, што па вытворчасці вапны Наркаммясцпром дасюль цягнецца ў хвосце за вытворчасцю прамысловай кааперацыі.

У кафельна-плітачнай прамысловасці павінна быць вырашана пытанне аб замене востраэфіцытнага волава, якое скарыстоўваецца для палівы, іншымі, недэфіцытнымі матэрыяламі. Неабходна пашырыць і мастацкае афармленне выпускаемых непаліваных кафель. Таксама наладзіць вытворчасць метлахскіх плітак, якія яшчэ да гэтага часу завозяцца ў БССР з іншых саюзных рэспублік, бо ў нашай рэспубліцы ёсць усе магчымасці для арганізацыі гэтай вытворчасці ва многіх месцах.

Ненармальным становішчам з'яўляецца адсутнасць у БССР прадпрыемстваў па вытворчасці ганчарных каналізацыйных труб. Яны завозяцца ў сучасны момант для пракладкі вулічных магістралей каналізацыі з Харкава і Кіева. Матывіроўкі некаторых работнікаў гэтай галіны, што няма ў Беларусі прыгодных для вытворчасці труб глін, зусім негрунтоўныя. Тут проста непаварот лівасць, а, можа быць, і нежаданне заняцца гэтай справай. Бо нават вышукальна-праектныя работы, якія павінны быць скончаны ўжо ў гэтым годзе, ідуць вельмі марудна і знаходзяцца пад пагрозаю зрыву.

Вельмі важная праблема — пластыфікацыя будаўнічых матэрыялаў. Для магчымасці скарыстання іх у будаўніцтве аба вязковай умовай павінна з'яўляцца ваданепранікальнасць. Папярэднія вопыты паказалі, што пластыфікацыя значна паляпшае трываласць будаўнічых матэрыялаў і дазваляе выкарыстаць гліны, якія лічацца нягодными для вытворчасці тых ці іншых будматэрыялаў.

Вельмі важным для паспяховай работы прамысловасці будматэрыялаў з'яўляецца перавод усіх прадпрыемстваў на тарфяны апал. Для гэтага трэба поўнасцю адмовіцца ад скарыстання напольных пячэй, якія даюць дарагую і недобраякасную прадукцыю, і замяніць іх больш удасканаленымі.

СЛЯПЯН.

УСЯМЕРНА РАЗВІЦЬ ІЛЬНОПРАДЗІЛЬНУЮ І ТКАЦКУЮ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ

За гады першай і другой пяцігодак у БССР непарўнана вырасла ільнаводства. Перамога калгаснага ладу стварыла ўсе ўмовы для ўсямернага пашырэння пасеўных плошчаў, у першую чаргу, высокагатункованага ільну; значна ўзнялася яго ўраджайнасць. У рэспубліцы вырасла сетка заводаў па первічнай апрацоўцы ільноволакна. У трэцяй пяцігодцы ільнаводства мае перспектывы далейшага хуткага развіцця.

Аднак, ільняная і ткацкая прамысловасць, не гледзячы на некаторае сваё развіццё, яўна адстала ад росту ільнаводства рэспублікі.

К пачатку першай пяцігодкі ў Беларусі існавалі толькі 2 ільнопрадзільныя фабрыкі: наша—імя Кагановіча (у мінулым «Дзвіна») і Высачанская — імя Карла Маркса. Цяпер заканчваецца будаўніцтва новага, Аршанскага ільнокамбіната. На нашай фабрыцы ўведзены ў эксплаатацыю новыя ватэры сістэмы Зварыкіна. Пушчана ў эксплаатацыю ткацкая фабрыка. І ўсё-ж, ільняная прамысловасць па тэмпах свайго росту адстала ад іншых галін прамысловасці і з'яўляецца самай адсталай галінай лёгкай прамысловасці.

Даволі ўказаць на той факт, што план другой пяцігодкі па ільнопрадзільнай прамысловасці далёка не выканан. На плану колькасць верацён на нашай фабрыцы ў другой палове 1937 года павінна была быць даведзена да 31.932, а фактычна мы цяпер маем усяго 18.360 верацён. Замест 1.000 ткацкіх станкоў, якія павінны былі працаваць у тры змены, у нас цяпер працуюць, у адну змену, толькі 45 станкоў.

Што-ж перашкаджае развіццю ільнопрадзільнай і ткацкай прамысловасці?

У нас стварыўся разрыў паміж першай стадыяй апрацоўкі ільноволакна — часаннем і прадзеннем. Зварыкінскія ватэры асвоены надзвычай слаба, і гэта прывяла да разрыву паміж прадзільным і ткацкім абсталяваннем. Да гэтага часу не створана камбінаваная вытворчасць. Усё гэта— прычыны чыста тэхнічнага парадку і іх, бясспрэчна, можна ліквідаваць.

Для ліквідацыі разрыву паміж часаннем і прадзеннем неабходна замяніць малапрадукцыйныя, старадаўнія часальныя гекельныя машыны на аўтаматы, якія зараз выпускаюцца ў масавым парадку на нашых заводах. Гэта аблегчыць працу работніц і намнога павялічыць прадукцыйнасць працы. Аўтаматы поўнасцю забяспечаць поўфабрыкатам прадзільныя цэхі.

Неабходна закончыць рэканструкцыю нашай прадзільнай фабрыкі з тым, каб давесці яе магутнасць да 30.000 верацён, працуючых у тры змены. Максімум увагі павінна быць аддана хутчэйшаму асваенню новых зварыкінскіх ватэраў, прычым, неабходна знішчыць усе тыя канструкцыйныя змены, якія былі ўнесены шкоднікамі ў гэтыя машыны.

Ва ўсёй шырыні ўстае пытанне аб камбінаванай вытворчасці. Арганізацыя камбіната, які аб'ядная прадзільную, ткацкую і адбельна-аддзелачную фабрыкі, прадугледжваецца Наркамлегпромам толькі ў 1940 годзе. Гэты тэрмін, безумоўна, трэба скараціць. Калі такі камбінат будзе пушчан у эксплаатацыю у канцы 1938 года (а такая магчымасць, безумоўна, ёсць), то мы зможам кожны год выпускаць 15 мільёнаў пагонных метраў тонкіх тканін рознастайнага асартымента і да 6.000 тон пражы. Арганізацыя камбіната дасць магчымасць ліквідаваць непатрэбныя транспартныя перавозкі, што патаніць кошт прадукцыі.

Надзвычайна востра стаіць пытанне аб высокакваліфікаваных, тэарэтычна падрыхтаваных кадрах. Неабходна стварыць спецыяльныя вучэбныя камбінаты. Пры Наркамлегпроме БССР павінен быць арганізован інстытут, або, у крайнім выпадку, тэхнікум ільняшчыкаў і ткачоў.

Таксама ў поўнай меры наспела пытанне аб арганізацыі навукова-даследчага інстытута.

Дырэктар ільнопрадзільна-ткацкай фабрыкі імя Кагановіча.

І. А. ЗАХАРАЎ.

НА ЗАВОДЗЕ імя КІРАВА РАСКРАДАЮЦЬ МАШЫНЫ

(Ад віцебскага карэспандэнта «Звязды»)

Гэты, з ралу вон выходзячы выпадак меў месца на станкабудаўнічым заводзе «Чырвоны металіст» імя Кірава. Пры правядзенні інвентарызацыі на 1-е красавіка гэтага года быў выкрыт недахват трох свідравальных станкоў, якія выпрацоўваюцца на заводзе.

Станок не іголка, прапасці не можа. Лічылі, пералічвалі, зноў лічылі і ўсё-ж трох станкоў нехапае. Нарэшце рашылі, што не інакш, як простая памылка начальніка станкабудаўнічага цэха, які быццам два разы ўключыў у рапарт адны і тыя-ж станкі. Гэта думка супакоіла кіраўнікоў завода, а нехапаючыя станкі, кажучы бухгалтарскай мовай, «асталіся вісець у паветры».

Аб гэтых злашчасных станках так-бы і зусім забыліся, калі-б не прыезд на завод прадстаўніка тэхснаба трэста «Карэльлес» (Петразаводск). Пакуль тут на заводзе думалі і меркавалі, у трэсце «Карэльлес» была праведзена рэвізія і рад рахункаў аказаліся сумніцельнымі, сярод якіх асабліва сумненне выклікаў рахунак на 2080 рублёў, прад'яўлены трасту магазінам «Станкаінструмент» (Менск) за адпраўленне двух свідравальных станкоў вытворчасці завода імя Кірава.

Цяпер, у сувязі з прыездам прадстаўніка трэста «Карэллес», высветлілася, што два свідравальныя станкі былі простанапраста ўкрадзены з завода загадчыкам аддзела збыту Краскоўскім па дагаворанасці з пастаянным прадстаўніком трэста «Карэльлес» у Віцебску Булкіным (апошні калісьці таксама працаваў на заводзе імя Кірава). Рахунак магазіна «Станкаінструмент» аказаўся фальшывым, імі-жа падробленым. Грошы прысвоілі. Да рэчы, гэты аферыст Булкін таксама прад'явіў свайму трэсту фальшывыя рахункі на 50.000 руб. ад зусім неіснуючага загатпункта № 2. У гэтай аперацыі прымае ўдзел і Краскоўскі.

Аферысты Булкін і Краскоўскі арыштаваны. Але не ў гэтым сутнасць. Нас цікавіць другое: як гэта магло здарыцца, каб з завода кралі станкі?

Ларчык адкрываецца проста. Тут, на заводзе, пытанне аб пільнасці ператворана ў пустаўзонную балбатню. Наконт пільнасці іспісаны горы рэзалюцый, а канкрэтна, каб сапраўды мабілізаваць рабочы калектыў на павышэнне рэволюцыйнай пільнасці, нічога не зроблена. Тут ўсё пабудавана на асабістым давер'і, а не на ўзаемакантролі, як гэта павінна быць.

У даным выпадку справа стаіць так. Гатовую прадукцыю прымае прыёмшчык аддзела тэхнічнага кантролю, які адказвае толькі за якасць прадукцыі. Пасля праведзенай ім прыёмкі машыны, станкі і дэталі астаюцца абязлічанымі. Склад гатовай прадукцыі на заводзе няма, і машыны прадаўжаюць аставацца ў цэхах і па ўсіх кутках заводскага двара. Ні адзін чалавек на заводзе за іх ужо не нясе ніякай адказнасці. Загадчык аддзела збыту зусім бескантролен у сваіх дзеяннях, калі яму захочацца, ён бяры гатовую прадукцыю і вывозіць яе з завода. Пропускі знаходзяцца ў яго-ж распараджэнні. Нават самае элементарнае — афармленне актам прыёмкі машын з цэха аддзелам збыту— таксама не правядзіцца.

На гэтым заводзе ў свой час арудвала контрэволюцыйная трацкісцкая арганізацыя, нанёсшая заводу нямала страты. Аднак заводскія арганізацыі, у прыватнасці заводакіраўніцтва (дырэктар тав. Слюзберг), амаль нічога не зрабілі па ліквідацыі рэшткаў шкодніцтва. Выпадак з свідравальнымі станкамі з усёй відавочнасцю гэта пацвярджае.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.

Аб бюракратах з Наркомасветы

(Пісьмо настаўнікаў).

Неаднаразова знімалі з работы за развал школ Чарапанава З. Е. у Будакашалёўскім раёне, але, зняўшы з работы ў адной школе, яго зараз-жа накіроўвалі ў другую. Так, у 1935 годзе Чарапанава раённы аддзел асветы прыслаў у недойкаўскую НСШ у якасці загадчыка навучальнай часткай і выкладчыка рускай літаратуры і мовы, а жонку яго Чарапанаву В. Д.—у якасці настаўніцы малодшых класаў.

Тут яны ўносілі ў асяроддзе настаўнікаў склокі, прыпісвалі лепшым з іх «непрыгоднасць да педагагічнай работы», ахайвалі. Чарапанаў свядома затрымліваў па месяцах расклады ўрокаў у сябе, што зрывала выкладанне праграмнага матэрыялу. Па сваёй дысцыпліне ён давёў непаспяховасць да 40 проц.

Чарапанава В. Д. у адказ на прынятыя меры з боку адміністрацыі ў адносінах яе, як склочніцы, даходзіць да большых спраў. 2 лютага яна самачынна выключае са школы адзінага хлопчыка-яўрэя, выгнаўшы яго за дзверы.

Уся гэта дзейнасць не выпадкова. Толькі нядаўна Чарапанаў З. Е. выкрыт як удзельнік калчакаўскіх банд. Наркомасветы зняў яго з работы настаўніка, але пры гэтым дапусціў буйныя памылкі. Дзякаў знайшоў час, каб пагутарыць з Чарапанавымі дзве гадзіны і вынесці «рашучы» загад, у якім дырэктар недойкаўскай школы, які мае 11-гадовы педагагічны стаж, т. Круцялёў абвінавачваецца ў склочніцтве, знімаецца з пасады і адхіляецца ад выкладання матэматыкі. Адначасова адмяняецца рашэнне атэстацыйнай камісіі, якая прысвоіла яму званне настаўніка пачатковай школы. У школе-ж астаецца Чарапанава В. Д., а выкладчыкам матэматыкі назначаецца Джанкоў, непісьменны, адхілены ад работы атэстацыйнай камісіяй.

Чарапанава, падтрыманая Дзякавым, вядзе ў школе і на сёння дэзарганізуючую работу. Яна зрывае і аплёўвае правільныя загады дырэкцыі, называе нас, настаўнікаў, рознымі агіднымі словамі. Яна супроць асобных настаўнікаў (Фейгеля і інш.) прымяняе проста недапушчальныя метады ўздзейнасці—помсту. Але ўціхамірыць яе ні педкалектыў, ні раённы аддзел асветы не могуць. І яна творыць свае агідныя справы па разбурэнню совецкай школы.

Мы абураны бюракратычным метадам кіраўніцтва Наркомасветы БССР, які, не высветлўшы на месцы факты, не праверыўшы іх, верыць склочніцы і маральна разлажыўшайся асобе, якая ахайвае ўвесь наш калектыў.

НАСТАЎНІКІ (6 подпісаў).

На высокім узбярэжжы прыгожага возера ў вакопіцах Астрашыцкага Гарадка пабудаван дзіцячы санаторый Наркомахоў здароўя БССР. Тут адпачываюць у адну змену да 80 выхаванцаў дзіцячых дамоў Беларусі. У дзіцячым санаторыі, пабудаваным у прыгожым хвойным лесе, дзеці знаходзяць здаровы і вясёлы адпачынак. НА ЗДЫМКУ: выхаванцы дзіцячых дамоў пасля прагулкі ў лес чытаюць казку.

Фото Раскіна.

ВЫПРАВІЦЬ ДАПУШЧАНЫЯ ПАМЫЛКІ

Цяжка сказаць, чым кіраваліся планавікі Наркамата комунальнай гаспадаркі БССР пры вызначэнні сродкаў на будаўніцтва ў раённых цэнтрах Беларусі артэзіянскіх калодзежаў. Ясна адно, што яны не выходзілі з дзелавых меркаванняў. Петрыкаўскаму раёну на пабудову калодзежа ў 100—120 метраў чамусьці вызначана 45 тыс. рублёў, Суражскаму— на калодзеж у 100 метраў—18 тыс. рублёў, а Горацкаму — на калодзеж такой-жа глыбіні—30 тыс. рублёў. Усе гэтыя лічбы далёкі ад сапраўднага кошту будаўніцтва, бо кіраўніцтва «Бурвода» за калодзеж у 100 метраў бярэ 51 тыс. рублёў.

Выходзіць, што будаваць адзін калодзеж прыдзецца 2—3 гады.

Наркамат комунальнай гаспадаркі і Дзяржплан БССР павінны тэрмінова выправіць дапушчаныя памылкі.

ПАЛЯКОЎ,
эканаміст-планавік Суражскага райвыканкома.

ПА СЛЯДАХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ «ЗВЯЗДЫ»

„ГРУБАЕ ПАРУШЭННЕ СТАЛІНСКАЙ КАНСТЫТУЦЫІ"

Пад такім загалоўкам у «Звяздзе» ад 15 сакавіка была змешчана карэспандэнцыя аб грубым парушэнні Сталінскай Канстытуцыі ў Віркаўскім сельсавеце, Клічаўскага раёна.

Сакратар Клічаўскага райкома КП(б)Б тав. Цішкевіч паведаміў нас, што матэрыял «Звязды» абмяркоўваўся ў первічнай партыйнай арганізацыі Віркаўскага сельсавета і бюро райкома КП(б)Б. За грубае парушэнне Сталінскай Канстытуцыі старшыні гэтага сельсавета Букатаму абвешчана суровая вымова з папярэджаннем, што пры паўтарэнні падобных фактаў ён будзе аддан суду. Намеснік старшыні сельсавета Скрыпко за злоўжыванні і правал фінансавай работы ад пасады адхілен.

Загадчыку фінаддзелам прапанавана выехаць у Віркаўскі сельсавет правесці рэвізію грашовых спраў.

РАДЫЁВУЗЕЛ БЕЗ КАНТРОЛЮ

Марына-Горскі радыёвузел (Пухавіцкі раён) працуе вельмі дрэнна. У вёсны Зарэчча, якая знаходзіцца каля самых Марына-Горак, на 55 двароў ёсць усяго дзве радыёкропкі. Як відаць, радыёвузел не клапоціцца аб шырокім абслугоўванні насельніцтва. Зусім адсутнічае тэхнічны кантроль над існуючымі радыёкропкамі.

Аб якасці радыёперадач таварыщ не прыходзіцца: у рэпрадуктарах заўсёды чуецца хрыпенне, свіст, бясконцыя перабоі.

І ніхто на такую нікудышную работу радыёвузла не звяртае ўвагі.

І. Н. ГОЛЕЎ.

ДА ТРЫЦЦАЦІГОДДЗЯ ПЯТАГА З'ЕЗДА ПАРТЫІ

І. ВОЛКАВІЧЭР

Трыццаць год таму назад (13 мая—1 чэрвеня 1907 г.) сабраўся ў Лондане V з'езд РСДРП—апошні з'езд партыі ва ўмовах царскага падполля. Партыя большэвікоў, ужо і тады фактычна самастойная, уваходзіла ў склад РСДРП, фармальна яднаўшай большэвікоў і меншавікоў.

З'езд адбываўся незадоўга да контрэволюцыйнага перавароту 3 чэрвеня (па ст. стылю) 1907 г., ажыццёўленага зверху царызмам. Краіна знаходзілася на перавале паміж часова пацярпеўшай паражэнне рэволюцыяй 1905—7 гг. і наступаўшай рэакцыяй. Уздым рэволюцыйнай хвалі вясною 1907 г., змяніўшы на некаторы час перыяд вялікага адліву рэволюцыі, знаменаваў, — таварыщ Ленін, — «прынцыпак адступлення і спробу адступаючых зноў перайсці ў наступленне». «Не будзь гэтых прынцыпкаў, — указваў Ленін, — палзея 3 чэрвеня 1907 года, гістарычна зусім непазбежная, паколькі адступленні аставаліся адступленнямі, мела-б месца раней, можа быць, цэлым годам, або нават больш, чым годам раней» (Ленін, Творы, т. XV, стар. 42).

Вось у гэты своеасаблівы і апошні адрэзак «трохгоддзя буры і націску» сабраўся V з'езд.

Велізарныя мытарствы давялося працярпець удзельнікам з'езда. Царскі ўрад прымаў усе меры к непапушчэнню склікання з'езда. Сабраліся было ў Капенгагене (Данія), але ў апошнюю хвіліну, пад ціскам царскага ўрада, дацкія ўлады забаранілі з'езд. Прышлося дэлегатам перабрацца ў Швецыю, у гарадок Мальме, але і там — такая-ж гісторыя. Нарэшце, удалося з'езду ўладзіцца сяк-так у Лондане, дзесьці ў памяшканні царквы.

З'езд быў па тых часах досыць шматлюдным. На ім было 336 дэлегатаў з раляючымі і дарадчымі галасамі, прадстаўляючымі і дарадчымі галасамі, прадстаўляючых 46 тысяч большэвікоў, 38 тыс. меншавікоў, 25 тысяч бундаўцаў, столькі-ж польскіх социял-дэмакратаў і 13 тысяч латышскіх социял-дэмакратаў. Дэлегатаў большэвікоў на з'езде было 105, меншавікоў 97, бундаўцаў 57, польскіх социял-дэмакратаў 44, латышскіх социял-дэмакратаў 29, так называемых «пазафракцыйных» 4.

Такім чынам, у адрозненне ад папярэдняга IV з'езда, V з'езд, як гаварыў таварыш Сталін, «быў большэвіцкі, хаця і не рэзка большэвіцкі» (І. Сталін, Лонданскі з'езд РСДРП (Запіскі дэлегата). Пратаколы V з'езда, выд. 1935 г., стар. 13).

З ліку ўдзельнікаў з'езда, апрача Леніна і Сталіна, на з'ездзе былі такія старыя большэвікі, як К. Е. Варашылаў, М. М. Літвінаў, Ем. Яраслаўскі, А. Г. Шліхтэр, А. С. Бубноў, Міха Ільчэнка і інш. і памёршыя ўжо А. Н. Склярэнка, Ст. Шаумян, А. М. Стопані, К. Н. Самойлава і інш.

З'езд, па сутнасці справы, падагуліў вынікі тэарэтычнай, тактычнай і арганізацыйнай барацьбы большэвікоў з меншавікамі і яго гнуснейшай рознавіднасцю — трацкізмам у перыяд рэволюцыі 1905—7 гг. Развіццё рэволюцыі 1905—7 гг. **прынесла поўную перамогу большэвізма.**

У разгарнуўшайся на самім з'ездзе вострай барацьбе паміж большэвікамі і меншавікамі сутыкнуліся яшчэ раз дзве лініі — рэвалюцыйна-марксісцкая лінія большэвікоў і ліберальна-буржуазная лінія меншавікоў. Розныя разуменні большэвікамі і меншавікамі карэнных пытанняў рэволюцыі 1905—7 гг. (якія разам з тым былі і карэннымі пытаннямі сусветнай рэволюцыі), задач пролетарыята і яго партыі,—усё гэта было ярка ўскрыта ў дакладах і спрэчках на з'ездзе. Выкрыццё буржуазнай сутнасці меншавіцкіх установак чырвонай ніткай праходзіць скрозь усе выступленні большэвікоў.

Ужо самое абмеркаванне парадку дня з'езда ўскрыла найглыбейшыя супярэчнасці, падзяляўшыя большэвікоў і меншавікоў, толькі фармальна аб'яднаных у складзе РСДРП. Большэвікі настойвалі на ўключэнне ў парадак дня з'езда важнейшых прынцыповых палітычных пытанняў, як «Абвастрэнне эканамічнай барацьбы і сучасны момант», «Класавыя задачы пролетарыята ў сучасны момант буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі», «Адносіны да буржуазных партый» і інш. Супроць уключэння гэтых прынцыповых пытанняў у парадак дня выступілі меншавікі, бундаўцы і называўшы сябе «пазафракцыйным» меншавік Іуда-Троцкі. «Апартуністычнае крыло нашай партыі, як і іншых социял-дэмакратычных партый, — пісаў Ленін, — абараняла «дзелавы», «практычны» парадак дня з'езда. Яно цуралася «агульных шырокіх» пытанняў. Яно забывала, што ў канцы канцоў шырока-прынцыповая палітыка ёсць адзіная, сапраўды практычная палітыка» (Ленін, Творы, т. XI, стар. 271).

У барацьбе вакол парадку дня з'езда, заняўшай многа дзён непераўрыўных і бурных пасяджэнняў з пазменнымі галасаваннямі і т. п., большэвікам удалося ўсё-ж дабіцца пастановкі (з ліку прапанаваных імі агульнапалітычных пытанняў) аднаго вялікага прынцыповага пытання — «Аб адносінах да буржуазных партый», «І гэтае пытанне, — гаварыў Ленін па гэтаму поваду, — устала на чале не толькі ўсіх прынцыповых пытанняў з'езда, але і ўсіх работ наогул. Так вышла і так павінна было выйсці іменна тому, што сапраўдная крыніцай амаль усіх, і безумоўна ўсіх, істотных разгалоссяў, усіх разыходжанняў па пытаннях практычнай палітыкі пролетарыята ў рускай рэволюцыі была розная ацэнка нашых адносін да непролетарскіх партый» (Ленін, Творы, т. XI, стар. 271). І сапраўды, у гэтым-жа галоўным пункце парадку дня з'езда аллюстраваны такія важнейшыя пытанні, як пытанне аб шляхах развіцця буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі з яе перспектывай перарастання ў социялістычную, пытанне аб саюзніках пролетарыята і яго гегемоніі або гегемоніі буржуазіі.

Вось па гэтаму-ж важнейшаму агульнапалітычнаму пытанню меншавікі пацярпелі поўны правал, а большэвікі атрымалі перамогу на з'ездзе: большэвіцкая ідэя гегемоніі пролетарыята была прызнана велізарнай большасцю з'езда. Рэзалюцыя большэвікоў была прынята за аснову і потым прынята цалкам, пасля неістотных паправак. Праўда, меншавікі і бундаўцы разам з Іудай-Троцкім, які беспаспяхова прабаваў на з'ездзе адыгрываць ролю правадыра «пазафракцыйнага» цэнтра, папрабавалі бясконцым патокам усякіх паправак скасіць прынятую за аснову большэвіцкую рэзалюцыю, выхаласціць з яе рэволюцыйны змест. Але яны і тут папярпелі паражэнне.

Перамогу, у выніку вострай барацьбы, на з'ездзе атрымалі большэвікі і па іншых пытаннях парадку дня з'езда — аб «рабочым з'ездзе», аб адносінах да профсаюзаў і інш.

Ліквідатарскую ідэю склікання «рабочага з'езда» меншавікі процістаўлялі скліканню партыйнага з'езда. Пад сцягам «рабочага з'езда» яны імкнуліся дэзарганізаваць і ліквідаваць партыю рэволюцыйнага пролетарыята, стварыць замест апошняй новую легальную «шырокую», «рабочую партыю», якая заклікана была правядзіць ліберальную буржуазную палітыку ў рабочым класе. Большэвікі і да з'езда і на самым з'ездзе бязлітасна выкрывалі ліквідатарскую сутнасць адстойваемага меншавікамі «рабочага з'езда». І па гэтаму пытанню з'езд таксама прыняў за аснову большэвіцкую рэзалюцыю. Папраўкі прынцыповага характару амаль усе былі адкінуты. Прынятая рэзалюцыя падкрэслівала, што ідэя «рабочага з'езда» «вядзе да дэзарганізацыі партыі і салідзнічае падпарадкаванню шырокіх рабочых мас уплыву буржуазнай дэмакратыі». «Агітацыя за беспартыйны рабочы з'езд, — гаворыцца ў рэзалюцыі, — шкодна для класавага развіцця пролетарыята» (Пратаколы V з'езда РСДРП, выд. 1935 г., стар. 644). Такім чынам, з'езд адкінуў ліквідатарскую ідэю «рабочага з'езда», як шкодную, накіраваную супроць партыі.

Па пытанню аб адносінах да профсаюзаў таксама прынята прапанова большэвікоў аб прызнанні профсаюзамі ідэйнага кіраўніцтва партыі рэволюцыйнага пролетарыята.

Прымірэнчыя хістанні польскіх і латышскіх социял-дэмакратаў мелі ўплыў на некаторыя рашэнні з'езда, асабліва на першай стадыі работы з'езда, пры абмеркаванні парадку дня з'езда, справаздач ЦК і думскай фракцыі. Што-ж датычыць бундаўцаў, то яны амаль усе фактычна падтрымлівалі меншавікоў. Фармальна-ж яны вялі двухсэнсавую палітыку — палітыку «таргашоў, якія вечна выглядваюць і вечна чакаюць з надзеяй: а можа заўтра пукар падзешавее» (І. Сталін, «Лондансі з'езд РСДРП», Гл. Пратаколы V з'езда, стар. 13).

На элементы, якія хістаюцца, галоўным чынам, з нацыяналаў, ускладаў вялікія надзеі Іуда-Троцкі. Са скуры лез ён, каб утварыць цэнтр на з'ездзе.

Колькі ён ні прабаваў пазіраваць на з'ездзе ў ролі правадыра «цэнтра», з усіх яго патуг утварыць цэнтр нічога не атрымалася, і «Троцкі аказаўся «прыгожай непатрэбнасцю» (там-жа, стар. 13). Перамога большэвікоў на V з'ездзе, усяго толькі праз год пасля «аб'яднаўчага» з'езда 1906 года, аддаўшага ЦК у рукі меншавікоў, была пяжкім ударам па меншавіках. Аднак, да поўнай перамогі над меншавікамі было яшчэ далёка.

Прадстаяла працяглая барацьба з гэтай агентурай буржуазіі ў наступіўшую неўзабаве зырочную паласу рэакцыі. Таварыш Сталін, дэлегат з'езда, успамінае па гэтаму поваду: «Я ўпершыню бачыў талы Леніна ў ролі пераможны. Звычайна перамога кружыць галаву іншым правадырам, робіць іх фанабарыстымі і ганарлівымі. Часцей за ўсё ў такіх выпадках пачынаюць святкаваць перамогу, спачываць на лаўрах. Але Ленін ні на ёту не быў падобным на такіх правадыроў. Наадварот, іменна пасля перамогі пабіўся ён асабліва пільным і насцярожаным. Помніцца, як Ленін настойліва ўпушчаў талы дэлегатам: «Першая справа — не захапляцца перамогай і не зазнавацца; другая справа — замацаваць за сабой перамогу; трэцяя—дабіць праціўніка, бо ён толькі пабіт, але далёка яшчэ не дабіт». Ён едка высмейваў тых дэлегатаў, якія лёгкадумна запэўнівалі, што «з гэтага часу з меншавікамі пакончана» (І. Сталін, «Аб Леніне», Партыздавецтва, 1937 г., стар 29).

На працягу ўсяго часу работы з'езда большэвікі-дэлегаты, займаўшыя асобныя ад меншавікоў лавы, выступалі арганізавана, згуртавана. У часе перапынку паміж пленарнымі пасяджэннямі з'езда большэвікі — удзельнікі з'езда збіраліся на асобныя пасяджэнні і там папярэдне абмяркоўвалі пытанні, якія стаялі ў парадку дня з'езда.

На апошнім такім пасяджэнні, перад закрыццём з'езда большэвікі выбралі свой Большэвіцкі цэнтр, узначальваемы Леніным, фактычны ЦК большэвіцкай партыі.

Цэнтральны камітэт РСДРП, выбраны на з'ездзе, меў усё-ж у сваім складзе значную колькасць ліквідатараў і прымірэнцаў — скрытых трацкістаў. Натуральна, што гэта ліквідатарская частка складу ЦК сабатавала рашэнні V з'езда, старалася весці курс на зрыў работы партыйных устаноў, на ліквідацыю рэволюцыйнага падполля і рэволюцыйнай партыі пролетарыята. Пяць год ішла разлютаваная барацьба (у архіцяжкіх умовах злейшай рэакцыі і шырокага наступлення контрэволюцыі) з меншавікамі-ліквідатарамі, з ліквідатарамі павыварат (адзавісты, ультыматысты), з цэнтрысцка-ліквідатарскай гідэтай Іуды-Троцкага, з бясспрынцыпным прымірэнцтвам скрытых трацкістаў, з апартуністамі, цэнтрыстамі і поўцэнтрыстамі з II інтэрнацыянала. І толькі ў студзені 1912 года на Пражскай канферэнцыі, адыграўшай ролю з'езда партыі, быў завершан вялікі этап барацьбы поўным выгнаннем ліквідатараў усіх рознавіднасцей. На Пражскай канферэнцыі большэвікі назавсёды пакончылі з фармальным аб'яднаннем з меншавікамі і канчаткова аформіліся ў асобную, не толькі фактычную, але і фармальна самастойную большэвіцкую партыю.

Пад кіраўніцтвам гераічнай партыі Леніна—Сталіна, у бязлітасной барацьбе з самымі рознастайнымі ворагамі социялізма, створана магутная социялістычная дзяржава рабочых і сялян. Знішчаючы ворагаў народу, узмацняючы рэволюцыйную пільнасць, авалодваючы большэвізмам, найшырэйшыя масы нашай социялістычнай краіны ўпэўнена ідуць наперад, да новых перамог комунізма.

УПАРАДКАВАЦЬ РУХ ПРЫГАРАДНЫХ ПАЯЗДОЎ

Наступілі цёплыя дні. Тысячы працоўных Менска выязджаюць на дачы. Як-жа арганізаван прыгарадны рух паяздоў?

Пакуты прыгарадных пасажыраў пачынаюцца адразу па прыходзе на вакзал. Чакаць у агульнай зале вакзала ім забараняецца. Сотні пасажыраў вымушаны ў любое надвор'е па гадзіне і больш сядзець пад адкрытым нёбам.

Некалькі слоў пра «клопаты» Менгорсавета аб прыгарадным пасажыру. Яшчэ 9 мая 1936 г. пасля настойлівых патрабаванняў выбаршчыкаў было пастаўлена пытанне на пасяджэнні прэзідыума. Пасля доўгіх спрачак вынеслі пастанову — адпусціць на пабудову прыгараднага вакзала 15 тыс. рублёў. Запісалі. 16 чэрвеня 1936 года былі пераведзены 5-му ўчастку 8 тыс. рублёў і на гэтым супакоіліся. Там грошы атрымалі, але як іх выкарысталі — невядома і па сёння ні горсавету, ні начальніку станцыі.

Праз год Менгорсавет зноў успомніў пра павільён прыгараднага вакзала. 10 красавіка 1937 года гэта пытанне абмяркоўвалася на пасяджэнні прэзідыума. Была прынята яшчэ адна пастанова: «Улічваючы, што з адпушчаных горсаветам у маі 1936 года 5-му будучастку 15 тыс. рублёў на будаўніцтва павільёна прыгараднага вакзала, апошні атрымаў толькі 8 тыс. рублёў і павільёна не пабудаваў, а таму паставіць пытанне перад кіраўніцтвам Беларускай чыгункі аб пабудове на працягу сакавіка месяца (але не пазней 15 красавіка 1937 года) павільёна прыгараднага вакзала г. Менска».

15 красавіка ўжо даўно прайшло, а Менгорсавет из ўдасужыўся нават праверыць, чаму не выконваецца вынесеная ім самім пастанова.

Нельга прайсці і міма такога факта, як складанне новага раскладу руху прыгарадных паяздоў, 10 красавіка зацверджанага горсаветам.

Возьмем такую (заўсёды перагружаную) лінію, як Менск—Радашковічы. У гэтым напрамку з Менска будуць адыходзіць штодзенна 4 паязды, прычым, расклад пабудаван так, што адзін з саставаў (у 2 гадз. 30 мін. ночы) будзе выходзіць з Менска амаль паражняком, а два (8 гадз. 30 мін. і 15 гадз. 20 мін.) празмерна перагружаныя.

У напрамку Менск—Смалявічы—Барысаў кожны дзень едуць сотні рабочых, працуючых за горадам. Але гэтага моманту не ўлічылі пры зацверджанні раскладу руху паязлоў. Гадзіны адыходу (1 гадз. 25 мін. ночы, 3 гадз. ночы, 17 гадз. 18 мін. вечара і 21 гадз. 40 мін. вечара) не забяспечваюць своечасовы прыезд рабочых на работу, а таксама зварот дамоў.

У мінулым годзе шмат было скарг пасажыраў на таўханіну і беспарадкі пры пасадках. Адна і ў гэтым годзе пры ўсіх размовах аб культурным абслугоўванні пасажыраў становішча асталося ранейшае.

Ужо зараз, калі фактычна яшчэ не пачаўся дачны сезон, паязды адыходзяць з Менска (за выключэннем тых, якія ідуць уночы) перагружанымі да атказу. Пры пасадках таўханіна, лаянка. Ніхто з работнікаў чыгункі не адказвае за пасадку, не сочыць за парадкам.

Абслугоўваюць прыгарадныя паязды правадні́кі, не маючыя ніякага вопыту, і толькі на ўвесь састаў лазіцца адзін кваліфікаваны правадні́к-брыгадзір.

Законныя патрабаванні працоўных сталіцы аб культурным абслугоўванні пасажыраў прыгараднага руху астаюцца незадаволенымі.

Н. ДАВЫДАВА.

Выдатная выканаўца народных беларускіх песень 70-гадовая Адар'я Васільеўна Белановіч (Чырвонаслабодскі раён, Слуцкая акруга).

Фото Палуяновіча.

ПАВЕТРАНАЯ ВУЧЭБНАЯ ТРЫВОГА

Учора штабу мясцовай проціпавітранай і хімічнай абароны Менска стала вядома аб рыхтуючымся налёце самалётаў «ворага». У 19 гадз. 15 мін. у горадзе было аб'яўлена паграмажаючае становішча. Байцы каманд ППХА былі пераведзены на баявое становішча.

У 23 гадзіны трывожна завылі сірэны. Горад раптам пагрузіўся ў цемень. Супыніліся трамваі. Вуліцы апустелі ад пешаходаў. Праз 15 мінут быў дан адбой. Жыццё горада зноў пацякло нармальна.

Праведзеныя вучэнні часцей менскай проціпавітранай і хімічнай абароны паказалі баявую гатоўнасць сталіцы БССР даць рашучы адпор сапраўднаму ворагу. Але асобныя грамадзяне парушалі правілы светамаскіроўкі і не хаваліся ў пад'езды і памяшканні ў часе трывогі.

Пасля адбою паграмажаючае становішча з горада было знята.

У ЧАСЦЯХ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

КУЛЬТУРНАЯ РАНІЦА КАМАНДЗІРАЎ

Кожны выходны дзень у менскім Доме Чырвонай Арміі імя Варашылава праводзіцца культурная раніца камандзіра. З 12 гадзін і да паловы трэцяй гадзіны дня высокакваліфікаваныя навуковыя работнікі чытаюць камандзірам гарнізона лекцыі, пасля чаго дэманструюцца новыя совецкія кінофільмы. Зараз лекцыі чытаюцца па цыклу — выдатныя людзі вялікага рускага народа. Акадэмік Вальфсон прачытаў лекцыю на тэму: «Культурная спадчына і рабочы клас». Лекцыі аб Л. Н. Талстым і Герцэне прачытаў акадэмік Замошін, Прафесар Казлоў прачытаў лекцыю аб Менделееве. У гэтым месяцы яшчэ будуць прачытаны лекцыі аб Тімірязеве (праф. Годнеў), аб Паўлаве (праф. Манахаў) і аб Ламаносаве (праф. Казлоў).

Усе гэтыя лекцыі чытаюцца ў парадку шэфства навуковых работнікаў над Чырвонай Арміяй.

НА АДПАЧЫНКУ

У жывапісная мясцовасці сярод густога сасновага лесу знаходзіцца 10 утульных, прасторных і светлых дач ждановіцкага дома адпачынку імя 11 ліпеня. З 5 мая тут адпачывае 408 працоўных Менска і інш. раёнаў рэспублікі.

Дом адпачынку пачаў летні сезон гэтага года непараўнаўча лепш, чым у мінулыя гады. Кожны адпачываючы зараз дае папярэдні заказ на сняданне, вячэру і абед, ён выбірае па свайму жаданню стравы. На харчаванне няма ні адной скаргі. Адпачываючы па свайму жаданню можа снедаць з 8 г. 30 м. да 10 г. 30 м. раніцы, абедаць з 1 г. 30 м. да 4 гадзін дня і вячэраць з 8 г. да 9 г. 30 м.

Значна палепшылася ў параўнанні з мінулымі гадамі і культурнае абслугоўванне. Вось расклад культурнага адпачынку на 11 мая. У 8 гадзін раніцы была фізкультурная зарадка і калектыўнае разучванне песень. Ад 10 г. раніцы да 1 г. дня майстар Гардон даў сеанс адначасовай ігры ў шашкі. З 26 партый тав. Гардон выйграў у адпачываючых 25 і адну скончыў унічыю. Аматары танцаў да абеда разучвалі заходнія танцы. Па рачэцы Свіслач многія адпачываючыя каталіся на лодках, некаторыя іграли ў кракет, більярд і кегельбан. У культурнай, абсталяванай мяккай мэбляй чытальні адпачываючыя чыталі кнігі і газеты. Бібліятэка, якая налічвае 3.200 кніг, абмяняла да поўдня 100 кніг. Пасля вячэры арганізуецца вечар, прысвечаны Дню друку, пасля чаго дэманструецца кінофільм «Дарыко». У плане культурнай работы — лекцыі, канцэрты, гутаркі і т. д.

Усё пралугледжана для выгод і лепшага адпачынку. На выратавальным пункце інструктар навучае правілам карыстання лодкай. Аматарам-рыбаловам прадастаўляюцца вудачкі. Днямі адкрываецца швейная і шавецкая «Амерыканкі». Пачынаецца будаўніцтва велатрэка, закуплена 5 кавалерыйскіх коней для навучання адпачываючых коннаму спорту.

Зразумела, ёсць і рад істотных недахопаў у рабоце дома адпачынку. Тры дачы знаходзяцца ў нездавальняючым санітарным становішчы. Гэта яшчэ не ўстрывожыла як-след дырэктара дома адпачынку Дымана і абслугоўваючы медперсанал. Асабліва запушчана дача № 1. Няма дастатковай колькасці ларкоў з прахаладжальнымі напіткамі. Абслугоўваючы персанал яшчэ недастаткова чула і любоўна адносіцца да запатрабаванняў адпачываючых.

Ждановіцкі дом адпачынку адзін з лепшых у рэспубліцы. За год ён павінен прапусціць 10 тыс. чалавек. У доме ёсць усе ўмовы, каб даць працоўным сапраўды здаровы і карысны адпачынак. Трэба толькі больш уважліва прыглядацца да дробязей і ліквідаваць на-ходу малейшыя недахопы, чула прыслухоўвацца да скарг адпачываючых.

Н. ГАСМАН.

КАЛГАСНАЯ ГАСЦІНІЦА

У прыгожай мясцовасці каля фруктовага сада размешчан цэнтр самага буйнага ў Жлобінскім раёне калгаса «Рассвет». Як толькі звечарэе, калгасны двор, клуб, канцылярыя заліваюцца электрычным святлом. Моладзь і старыя пасля работы знаходзяць культурны адпачынак. Шашкі, доміно, газеты, журналы, музыкальныя інструменты, гукавое кіно—усё гэта ёсць у клубе.

У «Рассвет» многа прыязджае навуковых работнікаў, землеўпарадчыкаў, журналістаў, фатографаў, пісьменнікаў, сюды прыязджаюць экскурсіі з суседніх раёнаў і абласцей, каб пераняць вопыт работы, навучыцца, як трэба змагацца за высокі ўраджай.

Для прыезджых у калгасе пабудавана гасцініца на 7 коек. У адным пакоі стаяць тры ложкі, засланыя беласнежнымі простынямі, пасярод пакоя стаіць стол, накрыты белым абрусам. Тут заўсёды ляжыць свежы нумар газеты, стаіць графін з вадою. На вокнах — белыя фіранкі.

Такі-ж выгляд мае і другі пакой. У трэцім пакоі размешчана кухня і сталовая, дзе прыезджыя сталуюцца. Калгасніца Ева Кірыянава гатуе тлустыя снеданні, абед і вячэру.

Д. МАЛЕВІЧ.

КАПЯРЗДАДНІ ПЕРШАГА ТЫРАЖА ПАЗЫКІ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ

◎ З 10 па 25 мая па рашэнню прэзідыума ЦСПСБ камсолы, профарганізацыі і фінансавыя органы будуць праводзіць масавую праверку разадачы аблігацый рабочым, служачым, калгаснікам.

◎ Сустрэць тыраж поўнай аплатай пазыкі — такая баявая задача. Рад раёнаў рэспублікі з гонарам выканалі гэту задачу. Першымі поўнасцю аплацілі падпіску па калгаснаму сектару Горацкі Рэчыцкі, Талачынскі, Гомельскі і Чэрыкаўскі раёны.

◎ Фінансавая секцыя Вепрынскага сельсовета, Чэрыкаўскага раёна, абмеркавала мерапрыемствы падрыхтоўкі да тыража. Секцыя ўзяла на сябе рад абавязацельстваў па замацаванню дасягнутых поспехаў у фінансавай рабоце. Калгаснікі сельсовета яшчэ да 1 лютага поўчасню выплацілі сваю падпіску па пазыцы, усе атрымалі свае аблігацыі на рукі. Секцыя абавязалася рэгулярна ставіць справаздачы перад масамі па выкананню фінплана. Да 20 мая ў калгасах сельсовета будуць праведзены справаздачныя сходы аб рабоце ашчадкас. Фінсекцыя Вепрынскага сельсовета звярнулася да ўсіх фінсекцый совецкіх распублікі з заклікам узорна спаткаць тыраж.

◎ На 10 мая па Менску раздана аблігацый пазыкі другой пяцігодкі на 15 мільёнаў рублёў.

НОВЫ ГАТУНАК ШЫПУЧЫХ ВІН

Навукова-даследчы інстытут харчовай прамысловасці БССР закончыў першапачатковую праграноўку пытання па вытворчасці беларускіх іскрыстых він. З яблычнага соку, шляхам далейшага зображвання ў бутэльках і штучнага газавання, атрымана асвяжаючае, прыемнае на смак віно. Гэта віно па сваіх якасцях і асаблівасцях не ўступае некаторым шыпучым віноградным вінам. Работа па атрыманню гэтага віна пад назвай «Беларускае шампанскае» вялася на арданскім плодаягадным заводзе «Спартак». Зараз завод прыступае да масавага выпуску такіх він.

На працягу бягучага года інстытут будзе працаваць над атрыманнем аналагічных він з сокаў смародзіны, агрэсту і вішні.

СПАРТЫЎНЫ ДЗЕНЬ МЕНСКА

* Сёння ў Менску — вялікі спартыўны дзень. У Парку культуры і адпачынку праводзіцца першы веснавы крос па дыстанцыях комплексаў «ГПА». Па алеях пабягуць 3 тысячы фізкультурнікаў. Старт першага забегу ў 12 гадзін дня.

* Адначасова на трэцім кілометры Магілеўскага шасе адбудуцца традыцыйныя аўтамотагонкі на класічную дыстанцыю—адзін кілометр. Пяршынства аспрачваюць машыны розных марак: «ГАЗ-А», «М-1», «Бюік», «Форд» і інш.

* 150 юных гімнастаў горада сёння крымуць удзел у гарадскіх гімнастычных спаборніцтвах, якія адбудуцца ў садзе Палаца пінераў і акцябрат імя Гікало. У праграме — практыкаванні на брусах і турніку, роўнавага на буме, лазанне па канату, гімнастычныя прыжкі.

Прыгожую мастацкую пасуду вырабляе ганчарная арцель г. Барысава. Яе экспанаты накіраваны на Парыжскую выстаўку. НА ЗДЫМКУ: майстар арцелі за праверкай якасці выпускаемай на рынак прадукцыі.

Фото Я. Салавейчыка.

ПРЫЕЗД М. І. ЛІТВІНЕНКА-ВОЛЬГЕМУТ І І. С. ПАТАРЖЫНСКАГА

Учора з Кіева ў Менск прыехалі народная артыстка СССР — ордэнаноска М. І. Літвіненка-Вольгемут і народны артыст УССР — ордэнаносец І. С. Патаржынскі, запрошаныя на гастролі Беларускай дзяржаўнай філармоніяй. На вакзале народных артыстаў-ордэнаносцаў сустрэлі прадстаўнікі тэатральнай грамадскасці сталіцы БССР. У гутарцы з супрацоўнікам «Звязды» М. І. Літвіненка-Вольгемут і І. С. Патаржынскі падзяліліся мэтамі свайго прыезду:

— Наведаць сталіцу ордэнаноснай БССР мы збіраліся даўно. У той час, калі паміж літаратурамі нашых брацкіх рэспублік ужо ўстаноўлена шчыльная сувязь, паміж тэатрамі такой сувязі яшчэ няма. У гэтым сэнсе наш прыезд з'явіцца пачаткам творчага супрацоўніцтва. Мы ведаем і сочым за развіццём беларускага мастацтва. Нас цікавіць работа Беларускага тэатра оперы і балета, падрыхтоўка яго да 20-годдзя Кастрычніцкай рэволюцыі. Таксама нас вельмі цікавіць беларуская народная песня. Мы будзем вельмі рады, калі кампазітары БССР дадуць нам магчымасць папоўніць свой творчы багаж за кошт беларускай народнай творчасці.

М. І. Літвіненка-Вольгемут і І. С. Патаржынскі расказалі пра новыя работы ордэнаноснага Кіеўскага тэатра оперы і балета. Да 20-годдзя Кастрычніцкай рэволюцыі тэатр мяркуе паставіць оперу «Шчорс», над якой працуюць кампазітары Іорыш і Жданаў і паэты Рыльскі і Дольда. У бліжэйшы час тэатр выязджае на гастролі ў Ленінград.

14 і 15 мая ў менскім Доме Чырвонай Арміі імя Варашылава адбудуцца адкрытыя канцэрты М. І. Літвіненка-Вольгемут і І. С. Патаржынскага. У праграме канцэртаў — украінскія народныя песні і ўрыўкі з украінскіх опер.

У заключэнне гутаркі М. І. Літвіненка-Вольгемут і І. С. Патаржынскі прасілі праз друк перадаць гарачае прывітанне работнікам мастацтва і ўсім працоўным ордэнаноснай БССР.

ДОБРЫ УЧЫНАК ЖОНКІ МІЛІЦЫЯНЕРА

У ноч з 23 на 24 сакавіка гэтага года ў бабруйскай арцелі «Швейпром», шляхам узлому акна група зладзеяў зрабіла крадзеж гатовага адзення і мануфактуры на 16.000 рублёў. Зладзеі ўцяклі, і іх няма было адшукаць.

Выкрыць трапна схаваныя канцы крадзяжу дапамагла жонка старшага міліцыянера бабруйскага райадзялення рабоча-сялянскай міліцыі Аляксандра Аляксандраўна Елагвенка. У зробленай пакражы яна запалозрыла жыхароў аднаго дома, за якімі пачала пільна наглядаць.

На другую ноч яе муж, Павел Іванавіч Елагвенка, позна вярнуўся з дзяжурства і лёг спаць. Аляксандра рашыла панаглядаць за падазроным домам, хоць-бы ўсю ноч, толькі-б прасачыць злачынцаў. Пад ранне да гэтага дома ціха пад'ехала фурманка. Замітусілася некалькі чалавек з вуздамі, якія яны выносілі з хлява.

Адчуваючы, што сама яна не справіцца з гэтымі злачынцамі, Аляксандра паспяшыла разбудзіць мужа. Але за гэты час злачынцы селі на фурманку і кудысьці паехалі. Трэба было іх праследаваць.

Абое Елагвенкі селі на аўтамашыну. За два кілометры ад горада Бабруйска фурманка з пакрадзенымі рэчамі была дагнана, і злачынцы затрыманы.

За праяўленую актыўнасць у барацьбе з крымінальнымі злачынцамі народны камісар унутраных спраў БССР узнагарадзіў міліцыянера Елагвенку і ягоную жонку грашыма.

Н. В.

З апошняй пошты

НЕПІСЬМЕННАСЦЬ ЦІ ШКОДНІЦТВА?

У газеце «Ленінец» — Вышэйшай комуністычнай сельскагаспадарчай школы БССР імя Леніна ад 9 красавіка 1937 года змешчан артыкул дацэнта Сраговіча «Актуальныя пытанні веснавой сяўбы», які багаты памылкамі і радам шкодніцкіх установак, галоўным чынам у галіне пратручвання насення.

Так, аўтар артыкула піша: «Супроць мокрай галаўні пшаніцу пратручваюць сухім спосабам прэпаратам АБ у норме 100—150 грам на адзін цэнтнер зярна (павышаная норма ўжываецца пры моцнай заражонасці галаўнёй)». На самой-жа справе існуе толькі адна норма пры пратручванні насення прэпаратам АБ, а іменна: 150 грам прэпарата АБ на адзін цэнтнер насення.

Далей аўтар, гаворачы аб пратручванні поўсухім спосабам фармалінам, піша: «Гэтага раствору бярэцца 30 літраў на адну тону аўса, 20 літраў на адну тону ячменю, 15 літраў на адну тону пшаніцы». На самой-жа справе ўжываюцца наступныя рэцэпты: для аўса — 30 літраў на тону, для ячменю — 15 літраў (а не 20, як раіць аўтар). Што датычыць пшаніцы, то пшаніца, а таксама і жыта поўсухім спосабам зусім не пратручваюцца, бо пры пратручванні поўсухім спосабам пшаніцы і жыта разам з галаўнёй можа загінуць і насенне, ва ўсякім разе значна будзе паніжана ўсхожасць.

Прыходзіцца адзіўляцца, адкуль гэта Сраговіч выкапаў такі шкодніцкі рэцэпт?

Няправільна піша аўтар і ў адносінах пратручвання тэрмічным спосабам. Ён піша: «Зярно вымачваюць на працягу 4—6 гадзін у бочцы з вадой», а патрэбна толькі на працягу 4 гадзін.

Гэтым артыкулам карыстаецца тысяча студэнтаў Вышэйшай комуністычнай школы, якія раз'язджаюцца па ўсёй БССР. Гэтыя шкодныя рэцэпты прыпадносяцца Сраговічам у часе выкладання ім агранаміі будучым камандзірам социялістычнага земляробства.

Праф. Н. ДАРОЖКІН.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

ГАРАДСКІ ПАРК імя А. М. ГОРКАГА
(б. САД «ПРОФІНТЭРН»)
15 мая — АДКРЫЦЦЁ ЛЕТНЯГА СЕЗОНА — 15 мая

ЛЕКТОРЫЙ ПРЫ ЦЭНТРАЛЬНЫМ ДОМЕ ТЭХНІКІ (Комсамольская, 25)
12 мая для гаспадарнікаў, стахановаўцаў і інжынерна-тэхнічных работнікаў адбудзецца лекцыя прафесара С. М. ФРЫДА на тэму: «Бактэрыялагічная вайна».
Пачатак лекцыі роўна ў 8 гадзін вечара. Білеты ў канцылярыі Дома тэхнікі штодзённа з 2 да 4 гадзін дня (білеты для гаспадарнікаў — у наркаматах).

БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР (БДТ-1)
12 мая — Абан. № 106.
АПОШНІЯ.
Аноас! Скупы.

Памяшк. Дзярж. Жыдоўск. тэатра | БЕЛДЗЯРЖТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА
12 мая — Абан. № 35.
ЕЎГЕНІЯ ОНЕГІН.

Гукавы кінотэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» УМБАР

Гукавы кінотэатр «Пролетарый» ГОБСЕК

Дзіцячы гукавы кінотэатр у сувязі з рамонтам закрыт.

Гукавы кінотэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» НА АДПАЧЫНКУ

Гукавы кінотэатр «Спартак» КНЯЖНА МЭРЫ (нямы варыянт)

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 13 МАЯ:
16 — гутарка аб V з'ездзе РОДРП. 16.30 — літаратурная перадача. 17 — развучванне песень для дзяцей. 17.35— «Апошнія паведамленні». 18.30 — завочная партвучоба. 19.45 — канцэрт. 20.45 — літаратурная перадача на польскай мове. 21.15 — канцэрт. 23 — «Апошнія паведамленні». 23.15 — перадача на польскай мове.

ДАВОДЗІЦЦА ДА ВЕДАМА ДЭПУТАТАЎ ГОРСОВЕТА — членаў секцый: ПРАМЫСЛОВАСЦІ, ЖЫЛЛЁВАЙ, НАРОДНАЙ АСВЕТЫ І КОМУНАЛЬНАЙ,
што 14 МАЯ адбудуцца ПЛЕНУМЫ
гэтых секцый разам з актывам
у наступных памяшканнях:
ПРАМЫСЛОВАЙ СЕКЦЫІ — у Доме тэхнікі (Комсамольская, 25);
НАРОДНАЙ АСВЕТЫ — Горсовет (пакой 32);
КОМУНАЛЬНАЙ СЕКЦЫІ — клуб імя Сталіна, малая зала (Інтэрнацыянальная 11/19).
ЖЫЛЛЁВАЙ СЕКЦЫІ — клуб металістаў (Кірава, 12).
Пачатак работы пленумаў гэтых секцый роўна ў 7 гадзін вечара.
Улічваючы важнасць пытання—справаздачы бюро секцый аб іх рабоце і зацверджанне планаў работы,—яўка ўсіх дэпутатаў і актывістаў абавязкова.
Працоўныя на другіх зменах павінны быць вызвалены ад работы.
БЮРО СЕКЦЫЙ.

Гукавы кінотэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» — Ад 13 мая
гукавы мастацкі фільм вытворчасці Украінфільм
НАТАЛКА-ПАЛТАЎКА
Рэжысер Кавалерыдзе.
У гал ролях:
Наталка (спевы)—народная артыстка СССР ордэнаноска М. І. ЛІТВІНЕНКА-ВОЛЬГЕМУТ
Народны артыст УССР ордэнаносец І. С. ПАТАРЖЫНСКІ
і засл. артыст СКУРАТ.

ШКОЛА ФЗВ «БУДВУЧ» БЕЛПРОМБУДТРЭСТА
абвяшчае НАБОР вучняў
У КАМЕННА-ТЫНКАВАЛЬНЫ ЦЭХ
Тэрмін навучання — 1 год.
Школа забяспечвае вучняў стыпендыяй ад 45 да 75 р. у месяц па паспіховасці, і іншагародніх — інтэрнатам.
Прымаюцца асобы па ўзросце ад 15 да 19 год з адукацыяй 6—7 класаў.
Дакументы трэба прадставіць наступныя: заяву, даведку аб адукацыі, аб здароўі, аб соцстановішчы, метрыку, дзве фотакарткі і на 40 кап. паштовых марак, на наступнаму адрасу: г. Менск, Рымарская, 32, школа ФЗВ «Будвуч».
Тэрмін падачы дакументаў да 25 мая.

Свяцяйце! 25 мая 1937 года у Маскве адбудзецца ПЕРШЫ ТЫРАЖ ВЫЙГРЫШАЎ па пазыцы другой пяцігодкі (выпуск чацвёртага года). У ТЫРАЖЫ ПУЖКІ РАЗЫГРАНА 1 МІЛЬЁН ВЫЙГРЫШАЎ на суму 164 мільёны 920 тысяч рублёў
Другі тыраж — 25 чэрвеня 1937 г.

БЕЛДЗЯРЖКІНО праводзіць дадатковы НАБОР
НА АКЦЁРСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ ВХУ.
Заявы прымаюцца ад асоб абодвух полаў ва ўзросце ад 17 да 25 год з сярэдняй адукацыяй пры наяўнасці спецыяльнага выгляду.
ІСПЫТЫ праводзяцца ў аб'ёме сярэдняй школы па рускай і беларускай мовах і літаратуры, геаграфіі і агульнапалітычнаму развіццю і апрача таго спецыспытыі для выяўлення прафесіянальнай прыгоднасці.
Асобы, якія закончылі ў 1936-37 г. дзесяцігодку на выдатна і добра, ад імкнуцца па агульнаадукацыйных дысцыплінах вызваляюцца.
Прыём заяў з фотакарткай праводзіцца да 15 мая ўключна па адрасу: г. Менск, Совецкая, 60, Белдзяржкіно (2-гі паверх, пакой 13).
Прынятыя забяспечваюцца стыпендыяй, інтэрнатам, не забяспечваюцца. Тэрмін навучання 4 гады. Пачатак заняткаў 1 чэрвеня 1937 г.
БЕЛДЗЯРЖКІНО.

У аддзел аб'яў звяніце па тэл. 21-845

На падставе пастановы НКаховы здароўя і Наркомасветы БССР, МЕНСКІ ГАРАДСКІ АДДЗЕЛ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ І МЕНГАРАНА паведамляюць, што ДЗЕЦІ, ЯКІЯ ПАСТУПАЮЦЬ У ШКОЛУ ў 1937 г., ПАВІННЫ ПРАЙСЦІ АБАВЯЗКОВЫ МЕДАГЛЯД І ЛЯЧЭННЕ да паступлення ў школу з мэтай аздараўлення.
Медагляд і неабходнае лячэнне праводзіцца ў ЦДД (вул. Луначарскага, 5) з 12 гадзін дня апрача агульнавыходных дзён і ў другой гарадской паліклініцы (Нова-Маскоўская вул.) з 10 гадзін раніцы.
МЕНСКІ ГАРАДСКІ АДДЗЕЛ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ.
МЕНГАРАНА.

ДРУКАРНІ імя СТАЛІНА патрабуюцца:
РАБОЧЫЯ І РАБОТНІЦЫ у пераплётны цэх,
ПРЫЁМШЧЫЦЫ у машынны цэх,
ПАЖАРНІКІ,
ТЭХНІК-нарміроўшчык па металаапрацоўках і
ПРЫБІРАЛЬШЧЫЦЫ.
Звяртацца ў аддзел кадраў, Дом друку (3 паверх, пакой № 65) з 9 гадзін раніцы да 2 гадзін дня.

Уп Галоўлітбела № К—2087. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63. Б. К. С.